16+

ЛіМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 30 (5291) 9 жніўня 2024 г.

ISSN 0024-4686



Злавіць нітку адчуванняў стар. 6

Спрадвечнае святло і цішыня стар. 13

Новы погляд на «Жаніцьбу» стар. 14

Гульня: рэальнае і ўяўнае

Фота Лізаветы Голад.

Тэму гульні для змястоўнай выстаўкі «*GamEmotion*» у Палацы мастацтва арганізатары — а гэта Беларускі саюз мастакоў — выбралі наўмысна. Яна надзвычай актуальная. «Гульня суправаджае нас з самага дзяцінства, — падкрэсліла падчас урачыстага адкрыцця праекта першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч. — Прастора, у якую трапляе глядач, — гэта асаблівая прастора ўзаемадзеяння, створаная з дапамогай мастацкіх сродкаў. Да многіх работ можна не проста дакранацца — з іх дапамогай можна гуляць, напрыклад, сабраць свае пазлы альбо стварыць новы твор мастацтва. Самае цікавае, што ў экспазіцыі прадстаўлены работы мастакоў розных пакаленняў».

Выставачны праект «*GamEmotion*» презентуе творчасць 75 сучасных мастакоў у кірунках класічнага, інтэрактыўнага і лічбавага мастацтва. Усе творы так ці інакш звязаны з тэмай гульні. Па вялікім рахунку, гаворка ідзе пра дзве рэальнасці: адна з іх лічбавая, агульная, што стала часткай жыцця любога чалавека, другая — глыбока асабістая, бо кожны знаходзіць у жыцці сваё акенца, якое дазваляе яму зазіраць ці нават паглыбляцца ў далёкі свет, дзе прыняты зусім іншыя правілы.

Працяг на стар. 12 ►

«ЛіМ»-акцэнты

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі з 30-годдзем з дня ўтварэння. Захоўваючы найлепшыя традыцыі айчыннай журналістыкі, буйнейшы медыяхолдынг краіны аб'яднаў сапраўдных зорак эфіру, якіх ведаюць і любяць мільёны беларускіх грамадзян, канстатаваў Кіраўнік дзяржавы. «Прыемна, што імя нашай краіны ўпрыгожвае назвы каналаў грамадска-палітычнага, сямейнага, культурнага, спартыўнага і міжнароднага вяшчання. Усе разам і кожны паасобку, яны выхоўваюць і натхняюць свайго гледача на добрыя і карысныя пачынанні». Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што і ў далейшым высокія рэйтынгі праграм тэлерадыёкампаніі, павага яе супрацоўнікаў да беларускага гледача і слухача, пастаяннае імкненне да самаўдасканалення будуць садзейнічаць умацаванню інфармацыйнага суверэнітэту краіны.

Праект. Баль «Бібліятэчнае лета» ўпершыню пройдзе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі заўтра. Танцавальныя калектывы з розных гарадоў нашай краіны збяруцца разам, каб прадставіць маштабную танцавальную праграму. На шматлікіх майстар-класах зацікаўленыя госці змогуць засвоіць розныя элементы танца, абяцаюць арганізатары. Бібліятэчныя залы будуць адчынены для ўсіх жадаючых. Напрыклад, у зале беларускай літаратуры прадставяць майстэрню рэстаўратара, у зале дакументаў па мастацтве правядуць экскурсію па выстаўцы, прысвечанай Эдгару Дэга, а ў галерэі «Лабірынт» будзе працаваць музычна-літаратурная гасцёўня: прагучаць вершы у суправаджэнні раяля.

Памяць. Ускладанне кветак да магілы Якуба Коласа адбудзецца на Вайсковых могілках у дзень памяці Песняра — 13 жніўня ў 13.20. «Талент Песняра выключны і фенаменальны, і таму непадуладны ніякаму спасціжэнню, а вось адданасць яго свайму народу і Бацькаўшчыне зусім рэальная, выяўленая ў канкрэтных зямных справах. І жыццё паэта — узор і прыклад для ўсіх, хто хоча пакінуць добры след пасля сябе, паслужыць Айчыне незалежна ад таго, якой справе сябе прысвяціў», — адзначаюць у Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа. Удзел у жалобнай імпрэзе на Вайсковых могілках прымуць члены сям'і народнага паэта, грамадскія дзеячы, прыхільнікі яго творчай спадчыны.

Свята. Навагрудак з 23 да 25 жніўня будзе святкаваць 980-годдзе з дня першага летапіснага згадвання. Першымі святочнымі мерапрыемствамі стануць навукова-практычная канферэнцыя «Навагрудскія чытанні: гісторыя і сучаснасць Навагрудскага краю», фестываль гістарычнай рэканструкцыі, сярэдневяковай музыкі і танца «Меч караля», выступленнне Сімфанічнага аркестра Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. У праграме наступнага дня — урачыстае адкрыццё свята з удзелам беларускіх і расійскіх артыстаў, творчых калектываў з гарадоў-пабрацімаў Навагрудка, фестываль электроннай музыкі, праца інтэрактыўных пляцовак «Рыцарскі стан», «Горад дзяцінства», «Горад майстроў», «Спорт запальвае сэрцы». У завяршальны дзень святкавання на літаратурна-музычны салон з удзелам членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі і выстаўку-прэзентацыю «Лэдзі Дасканаласць» запросіць Дом-музей Адама Міцкевіча.

Музей. Фотавыстаўка «Забытыя героі: Першая сусветная вайна на фатаграфіях Паўла Веліканава» працуе ў замкавым комплексе «Мір», інфармуе БелТА. Праект падрыхтаваны на аснове калекцыі фатаграфій ваеннаслужачага 30-га Сібірскага стралковага палка Паўла Веліканава, што захоўваецца ў фондах Яраслаўскага дзяржаўнага гісторыка-архітэктурнага і мастацкага музея-запаведніка. «Зробленыя ім фатаграфіі адлюстравалі жыццё падчас вайны вачыма звычайнага чалавека: не толькі ваенна-вучэбныя і бытавыя заняткі, ад прыёму ежы да чысткі абмундзіравання, але і наступствы нямецкіх абстрэлаў, акопы і шмат іншага», — расказалі ў музеі. На прадстаўленых фотаздымках паказаны і Мірскі замак пасля артылерыйскіх абстрэлаў. Частка фота зроблена ў бліжэйшых да Міра вёсках. Выстаўка будзе працаваць да 29 жніўня.

Фестываль. «Нясвіжская фартэцыя», фестываль гістарычных рэканструкцый, збярэ аматараў гісторыі заўтра. Праграма ўключае ў сябе пешыя і конныя рыцарскія турніры, рэканструкцыю бітваў розных перыядаў, турніры па стральбе з лука і шабельным баі, а таксама паказальныя выступленні розных падраздзяленняў, якія прадстаўлены рыцарскімі клубамі краіны. У рамках фэсту пройдуць абласны праект «Кола традыцый Міншчыны», прысвечаны летнім абрадам, і кулінарны конкурс «Пернікавы цуд». Запланаваны паказы мастацкіх фільмаў пад адкрытым небам па галоўнай тэматыцы «Нясвіжскай фартэцыі».

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

стасункі

Башкартастан адкрывае беларускія імёны

У башкірскім часопісе «Бельскія прасторы», які выходзіць ва Уфе на рускай мове, пабачылі свет творы Рагнеда Малахоўскага (у перакладах Л. Гатавіцкай і І. Катлярова), Віктара Шніпа (у перакладзе А. Цяўлоўскага і Г. Аўласенкі) і Наталлі Касцючэнкі, якая працуе ў беларускай літаратуры на рускай мове (надрукавана яе эсэ «Ад вясны да восені»). Размова — пра вераснёўскі нумар аўтарытэтнага выдання за мінулы год. 196-цістаронкавы часопіс з дадаткам для юнага чытача «Классный журнал» (той мае сваю нумарацыю і складае яшчэ 12 старонак) толькі зараз патрапіў на вочы.

Руская мова на прасторах Башкартастана, аднаго з найцікавейшых рэгіёнаў Расіі, становіцца трывалым мастом у справе знаёмства чытачоў-башкартастанцаў з новымі творамі беларускіх пісьменнікаў. За гэта выказваецца асаблівая ўдзячнасць галоўнаму рэдактару «Бельскіх прастораў» пісьменніку Юрыю Гарухіну.

Беларуска-башкірскія літаратурныя сувязі маюць даўнюю гісторыю. Яны пачалі складвацца яшчэ ў 1930-я гады, калі ў Мінск на пленум Саюза пісьменнікаў СССР прыехала вялікая дэлегацыя пісьменнікаў з Башкартастана. У 2023-м у Мінску і Мінскай вобласці былі праведзены Дні башкірскай літаратуры ў Беларусі. У беларускіх перыядычных выданнях на працягу некалькіх мінулых гадоў усё часцей пачалі з'яўляцца публікацыі твораў пісьменнікаў Башкартастана — надрукаваны вершы і апавяданні Ларысы Абдулінай, Зульфіі Хананавай, Айгіза Баймухаметава (рыхтуецца да асобнага выдання ў перакладзе на беларускую мову яго аповесць «Не пакідай, мама!»). Спадзяёмся, што развіццё беларуска-башкірскіх літаратурных сувязяў будзе пашырацца. Гэта істотна паспрыяе дружбе народаў Беларусі і Башкартастана.

Мікола БЕРЛЕЖ

Прыгоды з марыйскім каларытам

Крысціна Архіпава, якая жыве і працуе ў Йашкар-Але (Расійская Федэрацыя, Марый Эл), выдала ў Мінску ў перакладзе на беларускую мову сваю аповесць-казку «Бардаклюшы ведаюць, чым заняцца». З анатацыі да кнігі: «Ёсць на свеце такія мясціны, дзе прыгоды не заканчваюцца ніколі. Дзе цябе заўсёды рады бачыць, тым больш, калі ты верыш у цуды. Там жывуць маленькія істоты — бардаклюшы, і любяць яны наводзіць беспарадак, асабліва ў кішэнях…»

Так, бардаклюшы — маленькія істоты, якія жывуць у кішэнях старой кашулі. Выпадкова на іх натрапляе хлопчык Савелій, якому яны даверяюць сваю таямніцу, расказваюць пра тое, што сябравалі яшчэ з яго дзядулем. Для доказнасці звяртаюць увагу хлопчыка на кнігу, якую ў шуфлядцы стала прыхаваў дзядуля, які і пісьмо-запавет пакінуў ўнуку…

Гульцяш і Бурчун, так завуць бардаклюшаў, разам з Савеліем трапляюць у самыя розныя гісторыі, але ўсе іх прыгоды звязаны з тым, каб усталёўваць справядлівасць, парадак, каб спрыяць перамозе дабрыні над злом і непарадкам. І ў выніку дзіўныя казачныя героі перамагаюць.

На беларускую мову аповесць-казку Кацярыны Архіпавай пераклаў Алесь Карлюкевіч. Кніга, якая выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда», ілюстравана малюнкамі Дар'і Масунавай, марыйскага кніжнага графіка.

Новае выданне — працяг развіцця беларуска-марыйскіх кнігавыдавецкіх сувязяў. У апошнія гады на старонках беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыкі з'явіліся публікацыі перакладаў твораў марыйскіх паэтаў і празаікаў Святланы Грыгор'евай, Юрыя Салаўёва, Генадзя Аяра, Анатоля Ціміркаева, Ігара Папова, Васіля Краснова. Зараз да выдання ў Марый Эл рыхтуецца анталогія беларускай дзіцячай літаратуры ў перакладзе на марыйскую мову.

Сяргей ШЫЧКО

прэзентацыі

У летапіс малой радзімы

«Жлобін чыгуначны» — так называецца кніга, якая пабачыла свет сёлета ў Жлобіне (ДП «Тэхнічная кніга»). Прэзентацыя новага выдання адбылася ў гарадскім цэнтры культуры.

Барыс Мінееў, Алег Попчанка, Мікалай Шуканаў (злева направа).

На імпрэзу завіталі кіраўнікі прадпрыемстваў Жлобінскага чыгуначнага вузла, ветэраны чыгункі і тыя, каму цікавая гісторыя малой радзімы. Выступаючы на прэзентацыі, кіраўнік спраў райвыканкама Людміла Пангліш адзначыла:

— Лёс многіх жлабінчан, у тым ліку і маіх родных, звязаны з чыгункай. Але час ідзе, падзеі сціраюцца з нашай памяці. А такія кнігі, як «Жлобін чыгуначны», захоўваюць іх, увекавечваючы гісторыю чалавечых лёсаў для будучых пакаленняў. У гэтым — галоўная каштоўнасць выдання.

Аўтарамі кнігі «Жлобін чыгуначны» сталі ветэран аховы здароўя, у мінулым галоўны ўрач Жлобінскай вузлавой бальніцы, ганаровы чыгуначнік БЧ, бізнесмен, краязнавец Алег Попчанка, патэнтны паверaны Рэспублікі Беларусь, краязнавец Барыс Мінееў і аўтар гэтых радкоў — журналіст, краязнавец. Алег Попчанка падкрэсліў:

— Новая кніга прысвечана 150-годдзю пачатку чыгуначнага руху праз станцыю Жлобін, 100-годдзю стварэння Жлобінскага раёна і 90-годдзю Жлобінскага вагоннага дэпо. Яе галоўныя героі — людзі, якія многія гады працавалі на чыгунцы. Сярод іх — начальнік лакаматыўнага дэпо, а затым кіраўнік гарадской адміністрацыі Уладзімір Ерафееў, сталяр і станочнік Станіслаў Міхайлоўскі, стаж якога на чыгунцы 56 гадоў!

Кніга стваралася ў цесным кантакце з чыгуначнымі прадпрыемствамі, ветэранамі дарогі. Выступаючы на прэзентацыі выдання, начальнік станцыі Жлобін Мікалай Сізоў падкрэсліў:

— Зроблена вялікая справа. Спадзяюся, гэта толькі пачатак, бо пра жлобінскіх чыгуначнікаў можна напісаць яшчэ шмат кніг.

Мікалай ШУКАНАЎ
Фота даслана аўтарам

не абмініце

Каляндар энцыклапедычнага характару

Выдавецтва «Беларусь» працягвае выпуск адрыўных календароў. У кнігарнях краіны ўжо можна знайсці і выданне, якое раскажа нам пра кожны з дзён наступнага года. Заказ і фінансавую падтрымку «Роднаму краю» ажыццявіла Міністэрства інфармацыі. Тыраж календара — 3000 асобнікаў.

З выдавецкай анатацыі: «Вы трымаеце ў руках адрыўны каляндар "Родны край" на 2025 год — своеасаблівую энцыклапедыю на кожны дзень. У календары вы знойдзеце шмат цікавага пра нашу краіну, яе гісторыю, культуру, славутыя мясціны. Наш каляндар дапаможа вам прасачыць юбілейныя даты знакамітых людзей нашай краіны, славутых беларусаў, што жылі ў розны час. Значнае месца ў выданні адведзена роднай мове. Вы даведаецеся пра старажытныя міфалагічныя ўяўленні нашых продкаў...» Каляндар па традыцыі адкрываецца словамі Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь... «Мы, беларусы, — мірныя людзі, // Сэрцам адданыя роднай зямлі...» Нагадаем, што словы гімна належаць Міхасю Клімковічу і Уладзіміру Карызну, а музыка — Нестару Сакалоўскаму.

У 2025-м споўніца 1210 гадоў з дня нараджэння Мяфодзія (815—885) — славянскага асветніка, аднаго са стваральнікаў славянскай азбукі, прапаведніка хрысціянства. І ўжо лісток ад 2 студзеня 2025 года — напамін пра гэтую падзею. Увогуле на старонках адрыўнога календара прысутнічае шмат згадак пра пісьменнікаў, асветнікаў, дзеячаў культуры. У 2025 годзе, нагадвае «Родны край», святкуюцца юбілеі наступных беларускіх пісьменнікаў: 16 студзеня — 120 гадоў з дня нараджэння беларускага дзіцячага пісьменніка Алеся Пальчэўскага; 16 лютага — 100 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі; 21 сакавіка — 185 гадоў з дня нараджэння аднаго з пачынальнікаў сучаснай беларускай літаратуры Францішка Багушэвіча; 25 сакавіка — 120 гадоў з дня нараджэння паэта і акадэміка, вучонага-біёлага Алеся Вечара...

«Родны край» падказвае юбілейныя даты першага ўпамінання ў розных летапісах паселішчаў Беларусі. Не забыліся выдаўцы (шкада, што ў выхадных даных не пазначаны імёны ўкладальнікаў, тых шчырых рупліўцаў, хто працаваў над падрыхтоўкай календара) і пра розныя добрыя парады. Таму зноў «Родны край» — не проста адрыўны каляндар з днямі-лісточкамі, а яшчэ і кніга сапраўды энцыклапедычнага характару.

Набыць каляндар «Родны край» можна ва ўсіх кнігарнях ААТ «Белкніга», а таксама ў «Акадэмкнізе» ў Мінску.

Прыемных уражанняў на кожны дзень! Прыемных чытацкіх адкрыццяў з «Родным краем»!

Мікола БЕРЛЕЖ

з нагоды

Мінулае дзеля сённяшняга

«Парк сярэдневяковай гісторыі Сула» размешчаны на жывапісным беразе аднайменнага возера ў 49 кіламетрах ад Мінска. Трапіўшы сюды, можна даведацца, як жылі, якімі рамёствамі займаліся нашы продкі. Радуе, што экскурсіі праводзяцца на беларускай мове. Думаецца, цяпер яна стане гучаць яшчэ часцей.

3 жніўня ў Парку прайшла ўрачыстая цырымонія адкрыцця Палаца беларускай мовы. На мерапрыемстве выступіў дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар Іван Саверчанка. Вучоны і пісьменнік, які ў сваіх шматлікіх артыкулах і кнігах часта звяртаецца да перыяду сярэдневякоўя ў нацыянальнай гісторыі, адзначыў ключавую ролю роднай мовы і літаратуры ў развіцці дзяржавы.

Іван Васільевіч нагадаў аб тым, наколькі глыбінныя вытокі роднага слова. Звярнуў увагу і на тое, як неабходна павышаць філалагічную культуру беларускага грамадства. «Беларуская мова і літаратура, — сказаў Іван Саверчанка, — утвараюць код нацыі, фарміруюць сістэму маральна-этычных каштоўнасцяў грамадства, спрыяюць інтэлектуальнаму і духоўнаму сталенню чалавека».

Ганна ІВАНЕЙ

Пра герояў вызвалення

Найстарэйшы літаратар Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, кандыдат гістарычных навук Барыс Далгатовіч папоўніў айчынную літаратуру аб Вялікай Айчыннай вайне новымі кнігамі-даследаваннямі.

У выдавецтве «Беларусь» у серыі «Беларуская дзіцячая энцыклапедыя» выйшла кніга «Героі баёў за Мінск летам 1944 года». У ёй расказваецца пра памятныя баі за вызваленне сталіцы Беларусі. У серыі «Гісторыя для школьнікаў» выйшлі кнігі «Сыны народаў Сярэдняй Азіі ў баях за Беларусь» і «Сыны народаў Закаўказзя ў баях за Беларусь», якія апавядаюць аб воінах вызваліцелях — прадстаўніках розных народаў Савецкага Саюза.

У выдавецтве «Колоград» убачылі свет кнігі «Ваеначальнікі — нашы землякі» і «Баявая слава Гомельшчыны». У іх прыведзены біяграфіі савецкіх маршалаў, генералаў і адміралаў — беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама раскрыты ўклад жыхароў Гомельскай вобласці, у тым ліку партызан і падпольшчыкаў, у нашу Вялікую Перамогу.

Прэс-служба МГА СПБ

акцыі

Разам з добрай кнігай

Выхад работнікаў культуры на прыдамовыя дзіцячыя пляцоўкі і зоны масавага адпачынку дзяцей дазваляе рэкламаваць кнігу і бібліятэку, пашыраць магчымасці цікавага і карыснага баўлення часу.

У практыцы Бярэзінскай раённай бібліятэкі ў летні сезон атрымала прапіску эстафетная вулічная акцыя «Кніга разам з дзетварой на пляцоўцы гульнявой». Выязны чытай-дворык з паходным тэатрыкам «Жывая кніга» зацвердзіў сваю запатрабаванасць сярод юных жыхароў райцэнтра. Мабільная форма дазволіла арганізаваць імправізаваныя калектыўныя чытанні апавяданняў сучасных пісьменнікаў і класікаў дзіцячай літаратуры.

Культурны дэсант Бярэзінскай раённай бібліятэкі высадзіўся ў дворыках на вуліцах М. Рамановіч і Кастрычніцкай, а таксама на пляцоўцы каля возера на вуліцы Перамогі. Інтэрактыўныя арт-паказы «Кніжка выйшла пагуляць» праходзілі з актыўным далучэннем саміх гледачоў. Падчас яркага відовішча дзецям даводзілася дэманстраваць свой артыстызм і выступаць у ролях герояў апавяданняў. Уменняў паставіць сябе на месца персанажа, правільна ацаніць яго ўчынкі, прапанаваць арыгінальны падыход да сюжэта вымагала бліц-імпрэза «Калі б героем апавядання быў я». Рэпертуар паходнага арт-тэатрыка склалі апавяданні Віктара Драгунскага «Падзорная труба», Мікалая Носава «Аўтамабіль», Леаніда Панцялеева «На моры», Міхаіла Зошчанкі «Прыгоды малпы», «Галёшы і марожанае», Рыгора Горына «Вожык», Тамары Бунты «Певень, або Я сама была вінаватая». Забаўныя кніжныя гісторыі з паходнага куфэрачка нагадалі хлопчыкам і дзяўчынкам, як паводзіць сябе дома, на вуліцы, на рэчцы, каго лічыць сапраўдным сябрам, як па-сапраўднаму любіць жывёл… Лета з добрай кнігай прыносіць двайную карысць.

За два летнія месяцы акцыя дазволіла захапіць звыш 100 юных гараджан, у тым ліку выхаванцаў з сем'яў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, дзясяткі маладых сем'яў з дзецьмі.

Тамара КРУТАЛЕВІЧ

«ЛіМ»-люстэрка

Генеральны дырэктар Гомельскага дзяржаўнага цырка Анастасія Сарасека стала лаўрэатам Міжнароднай прафесійнай цыркавой прэміі «Прызнанне». Аб гэтым *sb.by* паведамілі ў Міністэрстве культуры. Гала-шоу і цырымонія ўзнагароджання прайшлі на манежы Вялікага Маскоўскага дзяржаўнага цырка. Анастасія Сарасека атрымала ўзнагароду ў намінацыі «Міжнародны партнёр года». «Гэта заслуга ўсяго нашага калектыву, — адзначыла генеральны дырэктар Гомельскага дзяржаўнага цырка. — Кожны ўнёс свой уклад у тое, каб у гісторыю нашага роднага цырка была ўпісана яшчэ адна важная і яркая старонка. Мы ўсё робім для развіцця цыркавога мастацтва і ў кожнай справе адчуваем плячо Міністэрства культуры, якое разумее, як важна берагчы і ўзбагачаць адзін з самых цудоўных відаў творчасці — цыркавое мастацтва».

Пасольства Беларусі ва Узбекістане прыняло ўдзел у цырымоніі ўскладання кветак каля помніка Якубу Коласу, устаноўленага ў Ташкенце ў скверы, які мае імя класіка беларускай літаратуры. Аб гэтым паведамляе БелТА са спасылкай на беларускую загранустанову ў Ташкенце. Мерапрыемства прайшло ў рамках «Фестывалю дружбы», прымеркаванага да святкавання Дня дружбы народаў ва Узбекістане. Падчас імпрэзы выступілі часовы павераны ў справах Беларусі ва Узбекістане Аляксандр Апімах, старшыня цэнтра «Світанак» Галіна Татарэнка, а таксама прадстаўнікі Камітэта па міжнародных і дружалюбных сувязях з замежнымі краінамі і Саюза пісьменнікаў Узбекістана. Удзельнікі сустрэчы чыталі вершы Якуба Коласа на беларускай, рускай і ўзбекскай мовах.

Беларусь рэгулярна становіцца пляцоўкай для здымкаў замежных студый, гаворыцца на сайце *sb.by*. «Часцей за ўсё арандуюць пляцоўкі і абсталяванне расійскія партнёры. Ім падабаюцца лакацыі і кошты на паслугі. Нядаўна, напрыклад, сваё кіно прыязджалі здымаць калегі з "Татаркіно", — паведаміў дырэктар "Беларусьфільма" Юрый Аляксей. — У цэлым паступова наладжваецца міжнароднае супрацоўніцтва. Так, падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве з Кітаем. Цяпер ідзе праца над стварэннем сумеснага сцэнарыя. Усе таямніцы будуць раскрыты толькі пасля прэм'еры, але магу адзначыць, што ў карціне пакажуць Брэсцкую крэпасць, брэсцкага ліхтаршчыка, розныя мінскія лакацыі і шмат іншага. Плануем, што здымацца будуць кітайская і беларуская моладзь. Мы хочам паказаць сваю культуру, фальклор, традыцыі».

На першым міжнародным музычным фестывалі «*DREAM Fest 2024*», які праходзіў у Баку з 23 да 28 ліпеня, прынялі ўдзел беларускія артысты. *Open-air* аб'яднаў звыш 100 спевакоў з Азербайджана, Грузіі, Расіі, Турцыі, Узбекістана ды іншых краін свету. На маштабным шоу на беразе Каспійскага мора, са сцэны якога гучалі любімыя хіты многіх пакаленняў, Рэспубліку Беларусь прадставілі Лера Бернатовіч, Арцём Скароль і гурт *Cosa Nostra*. За шэсць дзён фестываль наведала больш за 60000 гледачоў, падкрэсліваюць арганізатары.

Больш як 2 тысячы чалавек прымуць удзел у III Міжнародным дзіцячым культурным форуме, які пройдзе з 22 да 24 жніўня на пляцоўцы адрэстаўраванага Маскоўскага палаца піянераў. Пра гэта паведаміла міністр культуры Расійскай Федэрацыі Вольга Любімава, перадае «ИТАР-ТАСС». Чакаецца ўдзел падлеткаў ва ўзросце ад 12 да 17 гадоў з Беларусі, Босніі і Герцагавіны, Бразіліі, Егіпта, Індыі, Кітая, Лівіі, Сербіі, Узбекістана ды іншых краін свету. У праграме форуму значыцца каля 60 мерапрыемстваў, сярод іх — майстар-класы, дыялогі з выдатнымі дзеячамі культуры, аглядныя экскурсіі ды іншыя цікавосткі.

Музей дзіцячага пісьменніка і паэта, сцэнарыста, скульптара, мастака і барда Юрыя Каваля створаць у нядаўна адрэстаўраванай Маскоўскай вежы Кірыла-Белазерскага музея-запаведніка. З 1963 года творца кожнае лета праводзіў на кірылаўскай зямлі, тлумачыць «ИТАР-ТАСС». Пастаянная экспазіцыя атрымае назву «Ад Чырвоных варот». Вядома, што раней сям'я пісьменніка жыла ў Харомным завулку каля Чырвоных варот, да таго ж менавіта такую назву носіць аўтабіяграфічная аповесць Юрыя Каваля. У Маскоўскай вежы манастыра на двух ярусах збудавання размесцяцца экспанаты з сямейнага архіва пісьменніка: карціны, скульптуры, эмаль, кнігі, фотаматэрыялы, запіскі і замалёўкі аўтара, яго асабістыя рэчы.

Выданне *Deadline* называе імёны ўдзельнікаў новай экранізацыі п'есы «Кароль Лір» Уільяма Шэкспіра. Раней удзел у карціне пацвердзілі лаўрэаты «Оскара» Аль Пачына і Джэсіка Чэстэйн. Так, склад папоўнілі Арыяна ДэБоз, Рэйчэл Бросанхэн, Пітэр Дзінклэйдж, Дэні Х'юстан, Крыс Месіна, Лакіт Стэнфілд, Стывен Дорф ды іншыя. Рэжысёрам і сцэнарыстам выступіць Бернард Роўз, вядомы па стужцы «Кэндзімэн» 1992 года.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

БЭЙ Вэньлі:

«Літаратура — галоўны носьбіт нацыянальнай культуры»

Бэй Вэньлі — сапраўдны, шчыры сябра Беларусі, беларускай культуры. Шмат гадоў узначальвае Цэнтр даследавання Беларусі ва Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэце ў Шанхаі. Некалі ён працаваў у Мінску. І зараз працягвае кантактаваць з дзеячамі культуры і літаратуры з Беларусі. Зусім нядаўна даследчык прыняў удзел у міжнародным круглым стале, прысвечаным беларуска-кітайскім гуманітарным і літаратурным сувязям. Мы вырашылі пагутарыць з прафесарам БЭЙ Вэньлі пра некаторыя праблемы ў развіцці беларуска-кітайскіх адукацыйных, культурных, літаратурных адносін.

— Бэй Вэньлі, як вы ацэньваеце на сённяшнім этапе стан беларуска-кітайскіх гуманітарных і культурных сувязяў? Што з'яўляецца асновай у іх развіцці?

— Абмены студэнтамі, выкладчыкамі, а значыць абмены паміж народамі Кітая і Беларусі, маюць даўнюю гісторыю. За 32 гады, якія прайшлі з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін, супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі дасягнула чатырох якасных паляпшэнняў і садзейнічала сцвярджэнню ўсепагоднага і усеабдымнага стратэгічнага партнёрства. Супрацоўніцтва ў галіне гуманітарных навук з'яўляецца важнай часткай двухбаковага супрацоўніцтва. Поруч з палітычным узаемадаверам і эканамічнай выгадай гэта стала краевугольнай кропкай судакранання ў сяброўскіх адносінах паміж дзвюма краінамі.

— Безумоўна, беларускія арганізатары культурнага ўзаемадзеяння на першы план у нашых міжкраінавых кантактах вылучаюць прасоўванне розных відаў мастацтва — жывапіс, скульптуру, харэаграфічнае мастацтва, музыку, тэатр. У баку ад вялікага руху аказваецца мастацкая літаратура. Што б вы параілі дзеля таго, каб нацыянальная паэзія, нацыянальная проза сталі значнай змястоўнай часткай гэтых працэсаў?

— Вобразы пластычных і выканальніцкіх мастацтваў яркія і зразумелыя, іх можна хутка ўспрыняць, і яны, натуральна, будуць і надалей выкарыстоўвацца ў якасці культурнага абмену. Літаратурныя ж творы патрабуюць перакладу, а тэкст не дае прамога візульнага вобраза, чытачу неабходны тлумачэнні, параўнанні і асацыяцыі. Аднак менавіта мастацкая літаратура з'яўляецца галоўным носьбітам нацыянальнай культуры. Прыгожыя літаратурныя творы адлюстроўваюць гістарычныя вытокі жыцця, паказваюць духоўны светапогляд і нацыянальныя памкненні.

— А ці ведаюць увогуле ў Кітаі беларускую літаратуру?

— Гісторыя перакладу і ўваходжання ў чытацкую свядомасць беларускай літаратуры ў Кітаі налічвае некалькі дзесяцігоддзяў. І за гэты час было тры кульмінацыйных моманты. Першы з іх прыпаў на завяршэнне 1940-х — 1950-я гады. Былі перакладзены на кітайскую мову і надрукаваны творы некаторых беларускіх паэтаў і празаікаў. Гэта — зборнік вершаў «Жалейка» Янкі Купалы (выдавецтва «Вэньгуан», 1949 г.), паэтычныя творы Якуба Коласа ў шанхайскім зборніку 1950 года «Вершы пра Вялікую Айчынную вайну Савецкага Саюза», кніга Аркадзя Куляшова «Толькі наперад», зборнік апавяданняў Івана Шамякіна. Выйшла таксама ў перакладзе на кітайскую мову аповесць Янкі Брыля... Было і некалькі іншых кніг. У тым ліку — і зборнік вершаў Максіма Танка ў перакладзе такіх вядомых перакладчыкаў, як Гэ Баацюань і Гаа Ман. Кітайскі чытач адкрыў для сябе такія імёны, як Кандрат Крапіва, Янка Маўр, Павел Кавалёў...

Наступны кульмінацыйны перыяд — гады з канца 1970-х... Падзьмуў вясенні вецер рэформ і адкрытасці. Кітай пачаў перажываць уздым у галіне перакладу рускай, увогуле савецкай літаратуры. І на гэтым этапе ўзмацнілася ўвага і да беларускай літаратуры. Кітайцы адкрылі для сябе прозу Васіля Быкава, у Паднябеснай выйшла каля дзесяці яго кніг: «Абеліск», «Дажыць да світання», «Альпійская балада», іншыя аповесці прачыталі мільёны кітайцаў... Па-новаму загучала ў Кітаі імя народнага пісьменніка Беларусі Івана Шамякіна. Ледзьве ці не дзясятак яго раманаў былі перакладзены і выдадзены ў Кітаі.

У новым стагоддзі адносіны дружбы і супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю пастаянна паляпшаюцца, дасягаюць узроўню «усепагоднага ўсеабдымнага партнёрства». Гэта не толькі стварае добрыя ўмовы для абмену і супрацоўніцтва ў галіне гуманітарнай адукацыі, але яшчэ і вылучае новыя патрабаванні далейшага ўмацавання ўзаемаразумення, стварае паглыбленне ў прызнанні... Сёння як ніколі мы прыгадалі, што ў мастацкай літаратуры ёсць такая важная функцыя, як магчымасць раскрыць перад чытачамі іншых краін асаблівасці нацыянальнага менталітэту свайго народа, паказаць культуру, асновы паўсядзённага жыцця. І асэнсаванне гэтай функцыі падштурхнула да развіцця чарговай, трэцяй, кульмінацыі ў справе перакладу беларускай літаратуры на кітайскую мову. У 2015 годзе паміж Кітаем і Беларуссю быў падпісаны Мемарандум па развіцці кітайска-беларускага праекта па перакладзе і выданні класічнай літаратуры. Пабачыў свет у Пекіне зборнік выбраных твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў. У гэту своеасаблівую анталогію ўвайшлі проза і паэзія. Выдадзены на кітайскай мове асобныя кнігі Андрэя Федарэнкі, Алеся Бадака. Ведаю, што сіламі перакладчыкаў, якія аб'ядналіся ў агульную каманду ў Другім Пекінскім ўніверсітэце замежных моў, рыхтуюцца новыя выданні... Калі пабачыла свет анталогія, то ў каментарыях адзначалася, што яна «не толькі адкрыла дзверы ў свет сучаснай беларускай літаратуры, але і прыцягнула ўвагу да яе, пасадзейнічала ўзаемнаму прызнанню і сяброўскаму абмену паміж кітайскай і беларускай культурамі».

— Дзякуй за падказкі па такім вызначэнні галоўных перыядаў, галоўных кульмінацыйных момантаў у развіцці літаратурных адносін Беларусі і Кітая ў XX—XXI стагоддзях. Думаю, што такі падыход возьмуць на ўзбраенне і нашы даследчыкі, і нашы практыкі... На ваш суб'ектыўны погляд, ці можна арганізаваць болей дзейснае партнёрства беларускіх і кітайскіх кніжных выдавецтваў? Ці магчыма стварэнне міждзяржаўнай праграмы ў гэтым кірунку?

— Я ўжо гаварыў пра мемарандум, які існуе паміж нашымі краінамі. Пэўна, варта напоўніць яго дзейсным зместам, выбудаваць у дадатак да гэтай важнай дэкларацыі дарожную карту. Як у Беларусі, так і ў Кітаі... У абедзвюх краін ёсць велізарнае жаданне супрацоўнічаць у галіне літаратуры. Трэба, відаць, паглядзець на вопыт такога супрацоўніцтва ў выпадку з іншымі краінамі.

Напрыклад, добрая мадэль — супрацоўніцтва паміж Дзяржаўным упраўленнем па справах прэсы і друку КНР і Міністэрствам лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі (былым Федэральным агенцтвам друку і масавых камунікацый). Пачаўшы ў 2013 годзе рэалізоўваць праект па перакладзе і публікацыі класічных і сучасных твораў кітайскай літаратуры, расіяне дасягнулі вялікіх вынікаў. І ў нас за апошнія дзесяць гадоў было надрукавана мноства кніг рускіх пісьменнікаў у перакладзе на кітайскую мову. Рух павінен быць выключна двухбаковым. За рашэннямі павінны быць канкрэтныя крокі, якія ў стане ажыццявіць непасрэдныя ўдзельнікі выдавецкага, кніжнага працэсу.

— Рухавіком многіх ініцыятыў, стварэннем трывалай платформы ў развіцці сувязяў паміж народамі і краінамі заўсёды з'яўляецца ўніверсітэцкая супольнасць. І зараз шмат увагі надаецца працы створанай у Мінску Асацыяцыі ўніверсітэтаў Кітая і Беларусі. Ці здольны вядучыя ўніверсітэцкія цэнтры Кітая выступіць галоўнымі арганізатарамі працы па літаратурнай кампаратывістыцы, развіцці параўнальнага літаратуразнаўства ў вывучэнні творчасці вядучых пісьменнікаў Кітая і Беларусі?

— Стварэнне напрыканцы 2023 года Кітайска-Беларускага ўніверсітэцкага альянса з'яўляецца буйной падзеяй у галіне адукацыі і культуры нашых краін, у галіне ўзаемадзеяння гуманітарнага характару паміж Кітаем і Беларуссю. Параўнальнае вывучэнне кітайска-беларускіх сувязяў, у тым ліку і ў галіне літаратуры, з'яўляецца адным з важных кірункаў у працы беларускіх даследчыцкіх цэнтраў і цэнтраў культурна-літаратурных даследаванняў ў большасці ўніверсітэтаў Кітая. Эксперты з Шанхая і іншых гарадоў праводзяць вялікую працу, афармляюць свае даследаванні ў выглядзе манаграфій, асобных навуковых і навукова-публіцыстычных выданняў. Праходзяць акадэмічныя канферэнцыі, семінары, праводзяцца фестывалі культуры і мастацтва... Гэтыя і іншыя мерапрыемствы, вядома, павінны стаць цвёрдым грунтам універсітэцкай супольнасці для распрацоўкі далейшых планаў, для аб'яднання рэсурсаў, для болей паглыбленага параўнальнага даследавання мастацкай творчасці кітайцаў і беларусаў.

— Вы з'яўляецеся кіраўніком Цэнтра даследаванняў Беларусі. Якое месца ў арганізацыі яго працы займаюць гуманітарныя, культурныя сувязі з Беларуссю?

— Цэнтр даследавання Беларусі ва Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэце быў створаны ў 2012 годзе. Гэта першы даследчыцкі ўніверсітэцкі цэнтр, зарыентаваны на вывучэнне Беларусі. У 2014-м Усходне-Кітайскі педагагічны ўніверсітэт і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь падпісалі Пагадненне аб супрацоўніцтве па развіцці Цэнтра вывучэння Беларусі пры УКПУ. Ключавой пазіцыяй Пагаднення з'яўляецца тое, што партнёрамі нашага Цэнтра могуць быць усе ўстановы адукацыі, падведамасныя беларускаму міністэрству. Гэта забяспечвае для нас унікальныя магчымасці, спрыяльныя ўмовы для супрацоўніцтва, абмену з беларускімі ўніверсітэтамі. Мэта ў Цэнтра — быць вядучай агульнацыянальнай базай для вывучэння беларускай гісторыі, культуры і кітайска-беларускіх адносін, а таксама для практычнага і эфектыўнага развіцця кітайска-беларускіх гуманітарных абменаў і супрацоўніцтва.

Па выніках даследаванняў маіх калег, якія працуюць у Цэнтры, надрукаваны шэраг калектыўных манаграфій, прысвечаных гісторыі, культуры Беларусі, пытанням нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, дзяржаўнай ідэалогіі Рэспублікі Беларусь. Мы прынялі ўдзел у працы па падрыхтоўцы і выпуску зборнікаў нарысаў, у якіх адлюстраваны погляды кітайцаў на сучасную Беларусь, успаміны паслоў, дыпламатычных работнікаў Кітая, якія працавалі ў Беларусі. Выдалі зборнік беларускіх народных песень і займаемся яго прасоўваннем у розных асяродках. За гады існавання Цэнтра праведзена мноства студэнцкіх семінараў. Мы разглядалі на іх ініцыятыву «Адзін пояс, адзін шлях», падводзілі вынікі 30-годдзя дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кітаем. Дзень роднай мовы, Дзень Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, іншыя нацыянальныя, дзяржаўныя святы беларусаў — гэта і святы нашага Цэнтра. Параўнальна нядаўна я ўдзельнічаў у фармаце анлайн у Тыдні кітайскай культуры і літаратуры ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага. Цікава было асэнсоўваць, што кітайская літаратура, кітайская культура прасоўваюцца ў самыя розныя рэгіёны Беларусі.

— Пачынаючы з 2014 года, мы выдалі ў Беларусі серыю з 14 кніг «Светлыя знакі: паэты Кітая», прадставіўшы ў перакладах на беларускую мову творы Ван Вэя, Ду Фу, Лі Бо, Ай Ціна, Лі Цінчжаа, Ван Гачжэня, Мэн Хаажаня, Вэнь Ідо, Сюй Чжыма... Каго б вы яшчэ з паэтаў Кітая параілі выдаць у гэтай серыі?

— Праца, якую ажыццявіў Выдавецкі дом «Звязда», у супрацоўніцтве з выдавецтвам «Мастацкая літаратура», работы кіраўнікоў гэтых калектываў і перакладчыкаў — усё гэта выклікае вялікую павагу. Мы ў Кітаі ўзрушаны рэалізацыяй гэтай праграмы. Мяркую, што вы ўжо набылі вопыт, які дае вам права працягнуць рэпрэзентацыю кітайскай паэзіі праз выданне «Кнігі вершаў». Яна павінна дапамагчы вам сфарміраваць храналагічную вось у справе знаёмства беларускага чытача з кітайскай паэзіяй на роднай беларускай мове...

Гутарыў Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Шанхай (Кітай) — Мінск (Беларусь)

Пацверджана

З гісторыі здымка Ядвігіна Ш.

На старонках «ЛіМа» 9 лютага 2024 г. быў надрукаваны артыкул аўтара гэтых радкоў «Пад пытаннем». Гаворка ішла пра імаверны здымак сям'і Антона Лявіцкага (псеўд. Ядвігін Ш.; 1869—1922), сёлетняга юбіляра. Пасля названай публікацыі пошукі магчымасцяў дакладнай ідэнтыфікацыі працягваліся. Цяпер ёсць нагода расказаць пра іх асноўныя этапы, але галоўнае — пра станоўчы вынік. Справа ў тым, што сёння растыражаваны адзіны фатаграфічны партрэт пачынальніка беларускай прозы. Зроблены на досвітку XX стагоддзя, ён моцна рэтушаваны, шматкроць капіраваны, таму, па вялікім рахунку, не можа мець статус абсалютна дакладнай фіксацыі знешнасці пісьменніка. Сумніўны яго патэнцыял аб'ектыўнасці (як першакрыніцы) і ў плане ўстанаўлення падабенства з іншымі выяўленымі візуальнымі артэфактамі.

З фондаў БДАМЛМ.

Сям'я Лявіцкіх: Антон і Люцыя з дзіцем, пачатак XX ст.

Вехі пошуку

Штуршком для пачатку архіўных росшукаў стала знаёмства з лістамі Ванды Лёсік (Лявіцкай), дачкі пісьменніка, да Юльяна Пшыркова, загадчыка сектара рукапісаў і выданняў Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, 1962—1964 гг., адпраўленыя з пасёлка Татарка Стаўрапольскага краю, што захоўваюцца ў фондзе старадрукаваных выданняў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.



З фондаў Літаратурнага музея М. Багдановіча.

Сядзіба Антона Лявіцкага ў Карпілаўцы, пачатак XX ст. Рэканструкцыя В. Маркаўца.

У адной з карэспандэнцый яна пісала пра сустрэчу ў Мінску ў 1959 годзе з Уладзіславай Луцэвіч, удавой Янкі Купалы, якая паведаміла, што мае ў асабістым архіве здымак Антона Лявіцкага, але яго яшчэ трэба знайсці сярод вялікай колькасці дакументаў. В. Лёсік раіла Ю. Пшыркову звярнуцца да радні на той час ужо спачылай уласніцы партрэта, сёстраў Янкі Купалы, якія добра ведалі яе бацьку, маглі дапамагчы з распазнаваннем.

Даследчыцкія запыты ў музей першага народнага паэта рэспублікі не пацвердзілі наяўнасць здымка. Такімі ж былі вынікі працы з фондам Ядвігі Раманоўскай, пляменніцы Янкі Купалы, у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

Парадаваў здымак, яшчэ не прыняты на пастаяннае захоўванне ў БДАМЛМ, на якім, верагодна, зняты Антон Лявіцкі з жонкай Люцыяй і дзіцем. Артэфакт працяглы час знаходзіўся ў нашчадкаў Максіма Гарэцкага ў Расіі, быў перасланы з Пецярбурга ў Аб'яднанне дзяржаўных літаратурных музеяў (Мінск), адтуль трапіў у БДАМЛМ. Меркаванні спецыялістаў наконт правільнай ідэнтыфікацыі разышліся, што і прадвызначыла некаторы падвешаны стан дакумента.

У пятым калене

Новае дыханне пошукам нечакана надаў маскоўскі напрамак. Восенню 2010 года музей Якуба Коласа ў Акінчыцах (мікрараён г. Стоўбцы) прыватна наведаў Станіслаў Макараў, прапраўнук Антона Лявіцкага і праўнук Язэпа Лёсіка. На памяць ад сужэнства Георгія (Юркі) і Соф'і Міцкевічаў ён атрымаў паэму «Новая зямля» 2002 года выдання з дарчым надпісам: «На добры ўспамін аб радзіме дзядоў і прадзедаў. 28.10.2010 г.».

Візітка, пакінутая ў Акінчыцах, перавандравала ў Мінск да Веры Міцкевіч, дзе яе і пабачыў аўтар гэтых радкоў. Хоць звесткі ўжо не былі актуальнымі, сувязь наладзіць удалося.

У Язэпа і Ванды Лёсікаў было трое дзяцей: Юрый, Люцыя і Алеся. Станіслаў Макараў — унук Люцыі, хрэсніцы Янкі Купалы, цікавіцца сваім радаводам; пабываў на магіле пісьменніка Ядвігіна Ш. у Вільні, адведаў месца спачыну Ванды і Алесі Лёсік у пасёлку Татарка Стаўрапольскага края.

Творчыя генерацыі

Пра вялікае значэнне сустрэч з Антонам Лявіцкім (Ядвігіным Ш.) у жыцці і творчасці Янкі Купалы, найбольш знакавыя з якіх адбыліся ў Карпілаўцы (сучасны Лагойскі раён), сведчаць вытрымкі з эпісталярнай спадчыны паэта.

З ліста да Браніслава Эпімаха-Шыпілы ў Пецярбург, адпраўленага з Акопаў (цяпер Лагойскі раён) 5 чэрвеня 1912 г.: «Напісаў у двух актах камедыю, каторую чытаў пану Лявіцкаму, і ён казаў, што напісана дарэчы. Камедыя называецца "Паўлінка", напісана прозай, з шляхоцкага жыцця».

З ліста да Льва Клейнбарта (Ленінград), напісанага ў Мінску 11 студзеня 1929 г.: «В период 1904 — 1906 гг., не помню именно в котором точно году, я познакомился с Ядвигиным Ш. (жили мы по соседству). Это было для меня большое событие, т. к. я впервые столкнулся с человеком, который не только писатель, которого печатают, но и пишет по-белорусски. С Ядвигиным Ш. я очень сблизился. Он мне много рассказывал о не знакомых мне до того времени писательских делах и т. п. Человек он был с высшим образованием (правда, университета из-за революционных дел не окончил), притом очень интересным и остроумным собеседником».

На месцы былой сядзібы

Сярод пытанняў аўтара гэтых радкоў, адрасаваных у Маскву, была і просьба ідэнтыфікаваць імаверны здымак сям'і Лявіцкіх. Бліжэйшая радня С. Макарава ўгледзела падабенства яго самога з мяркуемым Ядвігіным Ш. Прыемныя эмоцыі падбадзёрваюць пошукавікаў, але не могуць абгрунтавана і аўтарытэтна сведчыць на карысць папярэдніх высноў…

У канцы чэрвеня надарылася магчымасць падключыцца да экскурсіі па Лагойскім раёне, якая мела прыпынкі на нераспрацаваных турыстычных кропках. Асабліва вабіла вёска Карпілаўка, побач з якой некалі знаходзілася аднайменная сядзіба Антона Лявіцкага, падчас Першай сусветнай вайны аддадзеная ўласнікам пад дзіцячы прытулак, выхавацелькай у якім была яго дачка Ванда. Акрамя Янкі Купалы, сюды завітвалі Максім Багдановіч, Уладзіслаў Галубок, Палута Бадунова, іншыя вядомыя асобы ў гісторыі Беларусі.

З фондаў Літаратурнага музея М. Багдановіча.

Уладзіслаў Галубок «Гара каля Карпілаўкі», 14 лістапада 1916 г.

Фота Міколы Труса.

Гара каля Карпілаўкі. Сучасны выгляд.

Пра намер адправіцца ў падарожжа паведаміў у Маскву. Адтуль прыйшоў адказ: «Мы гатовы прыехаць»…

Цяпер на месцы сядзібы Антона Лявіцкага раскінуўся лес. Збоку дарогі ўстаноўлены памятны знак, але сапраўдны спакой гэтай мясціны вартуюць узгоркі і векавыя дубы. Змрочны дот — сведчанне лініі абароны, што існавала перад Вялікай Айчыннай вайной. Трохі воддаль прыватная сучасная забудова.

Тут і адбылася сустрэча з маскоўскім сужэнствам Станіслава і Наталлі Макаравых. Завочнае знаёмства змянілася рэальным поціскам рук, а нечаканым сюрпрызам стаў працяг азнаямлення расійскай радні са здымкам.

Станіслаў Макараў, прапраўнук А. Лявіцкага, з жонкай Наталляй. Карпілаўка, 30 чэрвеня 2024 г. Фота Міколы Труса.

Галіна Барабанава (Стаўрапаль), дачка Алесі Лёсік, якой 81 год, адназначна пацвердзіла, што такі ж быў у іх сямейным альбоме; на ім — Антон Лявіцкі з сям'ёй.

З гэтым архіважным сведчаннем рыса не падводзіцца. Антон, Люцыя… А хто з чатырох дзяцей на здымку? Дзе знята сям'я? У якім годзе?

Толькі цяпер пытанні паўсталі на больш трывалым падмурку. А вочнае знаёмства з нашчадкам Ядвігіна Ш. у пятым калене, незабыўныя эмоцыі падмацаваліся прыпынкам у музеі «Акопы», што ў вёсцы Харужанцы Лагойскага раёна. Тут у экспазіцыі, прысвечанай жыццю і творчасці Янкі Купалы, Карпілаўка і яе гаспадар — у ліку важных акцэнтаў біяграфіі народнага паэта.

Мікола ТРУС,
кандыдат філалагічных навук

Сонца высока

Знагоды 100-годдзя Васіля Быкава ў «Маладосці» апублікаваны святочныя матэрыялы Міколы Курыпкі, Віктара Шніпа, анкета пры ўдзеле Ігара Шаладонава, Марылі Буйны, Тамары Мазур і Андрэя Дарожкіна. Пастаянныя рубрыкі прозы і паэзіі напаўняюцца творчымі здабыткамі Настассі Нарэйкі, Ніны Літвінкі, Вікторыі Жытнік, Уладзіслава Грышына, Алеся Стружко, Наталлі Святловай, Пятра Жаўняровіча, Міхася Пазнякова, Змітрака Марозава і Івана Капыловіча. Творы кітайскага празаіка Лу Сіня з'яўляюцца сярод перакладаў (дзякуючы супрацоўніцтву з МДЛУ). Першая частка даследавання Кастуся Лешніцы, прысвечанага беларускай літаратуры ў свеце, у прыватнасці, з хронікі 1966—1985 гг., змяшчаецца ў «Знаках эпохі». 30-годдзю выдання зборніка Максіма Танка «Мой каўчэг» прысвяціў артыкул у рубрыцы «Літаратурны свет» даследчык Мікола Мікуліч. Кідкая вокладка колераў лайма і кавуна, дызайн і ілюстрацыя Мішы Дайлідава, а яшчэ выразныя карціны Ганны Плотнікавай на форзацах ствараюць візуальную аблямоўку нумара.

* * *

«*Яна свядома ахвяравала сабою дзеля мастацтва і, мяркую, не пашкадавала аб гэтым*». Апавяданні Настассі Нарэйкі — своеасаблівае прысвячэнне мастакам, якія з'яўляюцца адначасова гаспадарамі свайго таленту і ахвярамі сваёй адчувальнасці. Гучыць у творах тэма ўзаемаадносін з самім сабой, дзе суіснуюць адоранасць, сумнеў, пошук, выбар. Абмалёўваюцца складанасці стасункаў з навакольным светам, з людзьмі, асабліва з каханымі.

«*Так узніклі на тым полі могілкі як знак хрысціянскай міласэрнасці "цывілізаваных" людзей*». У зусім нязвыклым антуражы разгортваюцца падзеі апавядання Уладзіслава Грышына «Закон лесу». Экзатычныя для беларускай літаратуры краявіды і героі — апісваецца супрацьстаянне канадскіх індзейцаў кры і каланістаў. Апавяданне бачыцца данінай павагі заснавальніку прыгодніцкага і навукова-пазнавальнага напрамку ў айчыннай літаратуры — Янку Маўру. Не займаюся глыбокім факт-чэкінгам, ды не бачу у гэтым патрэбы, бо чытаю мастацкі твор, дзе павінны ўладарыць вымысел і ўмоўнасць. Прыкмячаю, як вымалёўваюцца вобразы: у кароткім тэксце адчуваецца канцэнтраваная ўвага аўтара да псіхалагічных, характаралагічных рыс персанажаў. Запамінальны момант выратавання хлопчыка-індзейца, адзінага з нямногіх, хто выжыў у яго паселішчы, дзякуючы аднаму з паляўнічых: «*Маўчанне маленькага кры не было нямой падзякай за выратаванне. З таго дня гэты хлопчык будзе ненавідзець усіх белых людзей, незалежна ад таго, хто яны*».

«*Звычайна слязьмі заканчваліся такія гутаркі*». Апавяданне пастаяннага аўтара «Маладосці», даследчыка і пісьменніка Пятра Жаўняровіча «Вясельны падарунак» перадае атмасферу апошняга пяцігоддзя. Тут паўстае адвечная тэма змагання пачуццёвага з рацыянальным. Ствараецца абагульненая карціна няроўнага шлюбу, які заключаецца паміж звычайным вясковым хлопцам і гарадской забяспечанай дзяўчынай. Рэмарка: маладыя кахаюць адзін аднаго, здавалася б, што можа пайсці не так? Але бацькі дзяўчыны — так бы мовіць, верхняя праслойка сярэдняга класа, поўныя паблажлівасці і фанабэрыі да абранніка іх дачкі і яе сям'і.

«*Колькі каштуе бохан хлеба*». Яшчэ адзін узор сталай прозы нумара — «Урокі сялянскай акадэміі. З рабочых дзённікаў маладога агранома» паэта, празаіка і публіцыста Змітрака Марозава. Аўтар выкарыстаў для стварэння дакументальнай аповесці дзённікавыя запісы 1986—1987 гадоў, якія ўтрымліваюць назіранні, уражанні ад працы вясковага агранома. Змітрок Марозаў падкрэслівае, што прафесійны рост і маральнае станаўленне галоўнага героя — пакручасты шлях (зрэшты Алесь Валошка трапляе ў тыповыя для яго эпохі абставіны — вясковы малады спецыяліст, які ўступае ў новы свет, вучыцца ўсяму ў жыцці). Адзін з важных чыннікаў у гэтым — атачэнне, людзі, якія падтрымліваюць і вучаць. Надзвычай дакладна Змітрок Марозаў выводзіць мудрасць: «*Напэўна, у гэтым і ёсць вышэйшая справядлівасць жыцця: перад хлебам усе людзі роўныя*».

Пісьменнік зазначае, што пакідае дакладнасць запісаў, захоўвае дакументалізм, каб падкрэсліць дух часу, паказаць праблемы сучаснай вёскі — «*праблемы не толькі сацыяльна-эканамічныя, але і палітычныя, без перабольшвання — гістарычныя*».

* * *

Чэрвеньская паэзія «Маладосці» пачынаецца з нізкі Ніны Літвінкі «Хачу быць шэдэўрам Тваім», у якой злучаны вера ў Бога і надзея на сябе, падкрэсліваецца важкасць чалавечага саюза і сумесных спраў, істотнасць узаемаразумення. Асаблівым, малітоўным, у пэўнай ступені наіўным і па-дзіцячы смелым тонам валодае верш «На спіне пчалы»:

Зрабі мяне рознай.
Я хачу быць
шэдэўрам Тваім, Божа.

І пылам ля ног.

Працягвае рубрыку любоўная лірыка Вікторыі Жытнік «З нас такія сабе акцёры...» (напэўна, такога азначэння просіць падборка вершаў паэтэсы). Тут увасабленне перажытага болю, страты, трывожнасці, ваганняў, надзвычайная асацыятыўнасць, умелыя характарыстыкі цялеснага, а яшчэ, тое, пра што сорамна і страшна казаць уголас — пра пачуцці, якія лічацца негатыўнымі. Вось яна, напрыклад, рэўнасць, а побач з ёй — прыніжэнне:

мне маё ж імя
становіцца ненавісным
калі з вуснаў тваіх
я чую
яе
імя

адчаю самотнага поўная
страшуся сваіх вачэй
ты казаў
што ў іх агонь гарыць
ды
яе
відавочна ярчэй

«***мне маё ж імя…»

Не зменіць панурага тону Алесь Стружко, чые два вершы пад тытулам «Адзінота мая, адзінота...» гучаць амаль безнадзейна. Быццам, нельга розумам спалучыць вобразы, што саспелі ў паэта і зафіксаваліся ў тэкстах, можна толькі злавіць нітку адчуванняў:

У нязрушнай пустэчы,
У пустэчы глухога задушша
Выспяваю зямлёю
знутры.

«Камякі»

Вершы Наталлі Святловай ствараюць кантраст з дзвюма папярэднімі нізкамі. Тут пануе паэзія музыкі, раўнавагі, любові да свету… Вядома, знайшлося месца роздумам на тэму кахання і гульні



з формамі. Асабліва кранальна гучыць твор «Чаму на сэрцы так спакойна», дзе персанальны анёл, які дорыць святло, — мама:

Таму што пазваніла маме,
І голас светлы азарыў,
І больш я не ў маркотным стане,
Адчуўшы новых сіл прыліў.

Ты аддаеш, як сок бяроза.
Лячу глынуць яго дамоў,
Прабач жа мне, аднак, за слёзы
Ад злых і рэзкіх маіх слоў.

Даруеш мне і зноўку поіш,
Глытаю сок святы нагбом.
Любоў у сэрцы чыстым тоіш,
Перапаўняючы дабром.

Ад першых радкоў нізкі Міхася Пазнякова не ўзнікла адчування трывогі — быццам свет поўны святла, а з добрымі людзьмі не здараецца нічога дрэннага. То бок, калі кіравацца бацькоўскім запаветам «Шчыруй і вер, і не хлусі!..», то жыццё будзе простым і зразумелым. Калі пашыраць, распаўсюджваць і, галоўнае, увасабляць на справе гэтую мудрасць, то самыя лепшыя часы абавязкова прыйдуць. «Красой азораны паэт», Міхась Пазнякоў абвяшчае ў сваіх вершах абсалют любові да ўсяго навакольнага свету.

Мне па-ранейшаму балюча
(Як у маленстве і было),
Душу гнятліва і пякуча
Людское ахінае зло.

Але ганю прэч боль і звады.
Сам-насам дзесьці ў глыбіні
Да чуйных слёз бываю рады
Людской гаючай дабрыні.

«***Мне па-ранейшаму балюча…»

Падборка вершаў «Абранай дарогай іду» Івана Капыловіча — пра долю, што выпадае чалавеку, пра ўдзел асобы ва ўласным лёсе, пра складаны выбар. Вобразы, якія паўстаюць у творах, нагадваюць пра вечныя тэмы, запрашаюць да філасофскіх роздумаў, праводзяць за паэтам па дарагіх яму мясцінах: валун-сузіральнік, які, здаецца, часта трапляе на вока, памятны старадаўні горад Сакі, дзе гаіліся раны, вёска — месца з запаволеным часам, але жывым і гаманкім наваколлем… Нізка суадносіцца з трыма словамі — час, шлях, памяць:

Спынюся на полі, на ўзмежку —
Аддам самы нізкі паклон,
Душой прыхінуся да сцежкі,
З якой на працягу тых дзён,

Што білі мяне, шкадавалі
І роздумы часу няслі,
Парою няўтульнай трывалі
І памяццю добрай былі.

«***Мяняюцца дні несупынна…»

«*Сонца не выходзіць, дзверы не адчыняюцца, дзень складаецца з двух прыёмаў ежы*». «Дзённік вар'ята» пісьменніка Лу Сіня ў перакладзе студэнта 5 курса факультэта кітайскай мовы і культуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Кірыла Булая прапанаваны сярод скарбаў сусветнай літаратуры.

* * *

Яшчэ пры знаёмстве з нумарам адгарнула выпадковую старонку і пабачыла знаёмую вокладку з надпісамі «*Vasil Bykov*», «*Alpine ballad*», «*Hold out till down*» — гэтую кнігу 1989 года я набыла мінулай восенню ў Санкт-Пецярбургу ў букіністычным аддзеле крамы непадалёк ад канала Грыбаедава. Яе вокладка — адна з многіх, якая ілюструе багацце выданняў твораў Васіля Быкава на замежных мовах. Хто цікавіцца тэмай — матэрыял Міколы Курыпкі «Васіль Быкаў на глобусе мастацкіх перакладаў».

«і новы чэрвень пачнецца
і прачнецца той хто народзіцца
на доўгай дарозе дадому»

Віктар Шніп дзеліцца дзённікавымі запісамі, звязанымі з лёсамі Васіля Быкава і яго жонкі Ірыны Міхайлаўны.

«*Выпрацоўваць механізм глыбіннага зроку бачання жыцця*». Адзін з самых цікавых матэрыялаў нумара (мажліва, адзін з самых цікавых у бягучым годзе) — анкета «Мой Быкаў». Чаму так? Таму што ў апытанні паўдзельнічалі рэспандэнты, якія так ці інакш звязаныя з літаратурай, людзі розных генерацый і сфер дзейнасці, а яшчэ кожны мае ўласныя дачыненні да асобы і творчасці Васіля Быкава. Чытачу, які ведае празаіка толькі па школьнай праграме альбо не ведае зусім, будзе карыснае меркаванне даследчыка-літаратуразнаўца Ігара Шаладонава, які не толькі вывучае творчасць народнага пісьменніка, але і падтрымлівае сувязь з землякамі Васіля Уладзіміравіча, бачыў яго на даўнейшых сустрэчах. Цікава разважае студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Марыля Буйна аб успрыманні спадчыны пісьменніка яе пакаленнем. Паэтэса і публіцыст Тамара Мазур сцісла распавядае аб перыядзе працы аўтара ў «Гродзенскай праўдзе», з гонарам заўважаючы, што народны пісьменнік правёў у горадзе над Нёманам чвэрць стагоддзя. Ніхто з апытаных, відаць, не даў такіх добрых парад фільмаў і тэатральных пастановак па творах Васіля Уладзіміравіча, як бібліятэкар і паэт (таксама звязаны з Гродна) Андрэй Дарожкін (згадваю гісторыі з «Доўгай дарогі дадому» пра здымкі, разумею, якія цяжкія фільмы, але іх варта паглядзець).

Расставіла свае акцэнты ў прачытаным, але пытанняў 6 і 6 адказаў — усё варта ўвагі.

* * *

«*Літаратурныя сувязі, пранікненне ў іншанацыянальны свет у значнай ступені залежныя ад індывідуальнай актыўнасці творцаў*». Тэма міжнародных культурных сувязяў пашыраецца ў рубрыцы «Знакі эпохі». Матэрыял Кастуся Лешніцы — хроніка літаратурнага жыцця 1966—1985 гг. — пацвярджэнне прысутнасці беларускай літаратуры ў свеце. Усе зацікаўленыя змогуць даведацца пра сустрэчы з нобелеўскім лаўрэатам Рамэнам Раланам, перакладчыкам на англійскую мову твораў (у прыватнасці, паэзіі і эпасу) народаў СССР Уолтэрам Мэем, перакладчыкам айчыннай класікі на польскую мову Мацеем Юзафам Канановічам і інш. Ідзе гаворка і пра беларускія кнігі, якія выходзілі на розных мовах, і пра замежную літаратуру, якая пабачыла свет на нашай радзіме.

«*…з'яўляецца калі не самай лепшай, дык адной з самых лепшых кніг беларускай паэзіі XX ст.*» Мікола Мікуліч пашырае «Літаратурны свет» грунтоўным тэкстам, прысвечаным 30-годдзю выдання зборніка Максіма Танка «Мой каўчэг» (1994).

Кацярына ЦІМАНОВІЧ

Вершы як напамін

«Гэта наша Памяць» — кнігу з такой назвай прэзентавалі ў Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы ў рамках святкавання Дня горада. Выданне прысвечана 80-годдзю вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пабачыла свет у выдаўца Наталлі Ніжнік пры падтрымцы Кобрынскай раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын.

— Амаль усе творы немагчыма чытаць без слёз. Яны кранаюць да глыбіні душы, — сказала ў пачатку прэзентацыі старшыня Кобрынскай раённай арганізацыі БСЖ, намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама Ганна Брынчук.

У праўдзівасці гэтых слоў прысутныя маглі пераканацца, калі слухалі вершы Надзеі Момлік, Алены Котавай, Наталлі Кандрашук.

Кніга «Гэта наша Памяць» аб'яднала пад адной вокладкай творы шасці сябраў літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які працуе пры Брэсцкім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кіраўнік клуба — Наталля Ніжнік (Кандрашук). У кнізе тры раздзелы: «Ля помнікаў бязлітаснай вайны», «Памяць сэрца», «Рэха Вялікай Айчыннай».

У першым раздзеле змешчаны вершы пра спаленыя вёскі Кобрыншчыны і помнікі загінулым. Нельга заставацца абыякавым, калі чытаеш імёны на гранітных плітах і разумееш, што сярод іх ёсць дзеці. Вайна — з'ява бязлітасная.

Другі раздзел — даніна памяці воінам-вызваліцелям, героям тылу і родным аўтараў.

Паэма Зінаіды Навасад «На смерць узятых ратаваў» апавядае пра сям'ю з вёскі Ляхчыцы Кобрынскага раёна. Ёсіп і Ганна Назарук адзначаны званнем «праведнікі свету» за выратаванне яўрэйскай дзяўчыны.

Чаму ён так рызыкаваў?
Адказ адзін тут будзе:
На смерць узятых ратаваў —
Так Бог наказваў людзям.

(З. Навасад. «На смерць узятых ратаваў»)

Наталля Кандрашук зарыфмавала падрабязнасці бою каля латвійскага пасёлка Букайшы, за які атрымаў званне Героя Савецкага Саюза ўраджэнец Кобрына Уладзімір Кірмановіч. Не магла паэтэса не прысвяціць верш і сваім дзядулі і бабулі — Мікалаю і Наталлі Лук. Падчас Вялікай Айчыннай вайны Наталля Сідараўна атрымала тры пахавальныя на свайго мужа, а ён вярнуўся жывым

Ганна Брынчук (трэцяя злева) і Наталля Ніжнік (Кандрашук) (другая злева) разам з іншымі аўтарамі кнігі.

у дзень абвяшчэння Перамогі, а літаральна праз год — 9 мая 1946-га — у іх нарадзілася дачка Ганна, маці аўтара гэтых радкоў:

Похоронка в руках —
Сердце сжалось от боли.
А в увядших глазах —
Слёзы вдовьей юдоли.

(Н. Кандрашук. «Удава»)

У трэцім раздзеле чытач знойдзе разважанні паэтаў на ваенную тэматыку. Нягледзячы на тое, што ўсе аўтары з'яўляюцца сучаснікамі і ведаюць пра вайну толькі па расказах продкаў або па кніжках і кіно, яны напісалі шчырыя, кранальныя радкі пра Вялікую Айчынную.

Верш Алены Котавай «Па прыколе» заснаваны на рэальных падзеях, якія адбыліся ў класе, дзе працуе настаўніцай англійскай мовы аўтар. Адзін з вучняў намаляваў фашысцкую свастыку, не ўсведамляючы, што гэта азначае.

Пришлось напомнить о страданьях предков,
Про стон Хатыней, выжженных дотла…
Зачем кресты рисуют наши детки?
Достаточно и так ведь в мире зла!

(А. Котава. «Па прыколе»)

Усяго ў кнізе 33 вершаваныя творы. У хуткім часе кніга з'явіцца ва ўсіх бібліятэках Кобрыншчыны, у тым ліку ў школьных.

Ніна ПЯТРОЎСКАЯ
Фота Жанны ЕЛІЗАРАВАЙ

Сучаснасць пакінута назаўтра?

У Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова выдадзены зборнік навуковых артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Куляшоўскія чытанні», якая прайшла ў вядучай ВНУ краіны 4—5 мая 2023 г.

Наклад выдання 48 асобнікаў. Пад адной вокладкай аб'яднаны матэрыялы пленарнага пасяджэння і чатырох раздзелаў: «Актуальныя напрамкі і пытанні мовазнаўства. Мова і мысленне. Мова і соцыум. Супастаўляльныя даследаванні моў. Медыяпрастора, медыялінгвістыка і медыястылістыка»; «Мастацкая літаратура Беларусі і нацыянальная самасвядомасць. Сусветная мастацкая літаратура і актуальныя праблемы літаратуразнаўства. Мова, стыль і інтэрпрэтацыя мастацкага твора»; «Актуальныя пытанні айчыннай і сусветнай гісторыі і культуры. Станаўленне, развіццё і ідэалагічныя асновы беларускай дзяржаўнасці»; «Актуальныя пытанні методыкі выкладання гуманітарных дысцыплін у вышэйшай і сярэдняй школе. Асаблівасці міжкультурнай камунікацыі ў адукацыйнай прасторы».

Больш за 40 дакладаў і выступленняў адлюстроўваюць характар, сутнасць «Куляшоўскіх чытанняў» 2023 года, удзел у якіх прынялі, акрамя вучоных, даследчыкаў з Магілёва, навукоўцы з Мінску (Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва, Нацыянальны інстытут адукацыі), Гродна (Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы), Расійскай Федэрацыі (Ліпецкі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя П. П. Сямёнава-Цян-Шанскага. Ялецкі дзяржаўны ўніверсітэт імя І. А. Буніна).

Што, мякка кажучы, «зачапіла», што падштурхоўвае да нераўнадушных разваг? Звернемся да другога раздзела, які, відавочна, аб'яднаў працы ўдзельнікаў аднаго секцыйнага пасяджэння — літаратуразнаўцаў, мовазнаўцаў. Прызнацца, хацелася знайсці хаця б адну тэму, так ці іначай звязаную з жыццём і творчасцю Аркадзя Куляшова, чыё імя носіць універсітэт, чыё імя дадзена канферэнцыі. Няўжо куляшовазнаўства спыніла сваё развіццё?!

Выдатна, што ў адным з дакладаў разглядаецца творчасць сучаснага літаратуразнаўца і пісьменніка — размова пра тэму «Уклад І. І. Саверчанкі ў навукова-адукацыйную і духоўна-культурную спадчыну Беларусі».

Ёсць яшчэ і даклад, звернуты да сучаснай рускамоўнай літаратуры Беларусі. Праўда, пабудаваны ён толькі на аглядзе творчасці 15 паэтаў Беларусі, якія пішуць на рускай мове і чые творы ўвайшлі ў калектыўны зборнік «Споведзь». Дарэчы, кніга пабачыла свет у 2010 годзе. Гэта, вядома, добра, што выданне разглядаецца. Хаця разам з тым і тэма ў назве заяўлена шмат шырэй.

Ёсць даклады, прысвечаныя творчасці Аляксея Дударава, Алеся Разанава, народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. І гэта надзвычай добра. Прысутнічаюць у гэтым і іншым раздзелах ці секцыях даклады, звязаныя з творчасцю рускіх пісьменнікаў: Валянціна Катаева, Захара Прылепіна, Ганны Ахматавай.

Шкада, што не знайшлося сярод удзельнікаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, якая прэзентуе і Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова, і Магілёўшчыну, тых, хто звярнуўся б да творчасці Аркадзя Куляшова, Максіма Гарэцкага, а яшчэ да спадчыны знакамітых пісьменнікаў-магіляўчан старэйшага пакалення. Сярод іх — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны Аляксей Пысін, народны пісьменнік Беларусі Іван Чыгрынаў, вядомы літаратуразнавец Міхась Мушынскі, ураджэнцы Магілёўшчыны, паэты, празаікі Алесь Пісьмянкоў, Анатоль Казлоў, Уладзімір Саламаха, Кастусь Кірэенка… І сёння ў Магілёве і вобласці жывуць і працуюць Алесь Казека, Мікалай Барысенка, Мікола Леўчанка, Віктар Арцём'еў, Алена Кісель, Жанна Міус, Уладзімір Ясеў і іншыя. Чаму б не звярнуцца да разгляду іх творчасці ў кантэксце грамадскага жыцця і развіцця беларускай літаратуры і культуры ўвогуле? Ці і надалей сучаснасць будзе пакінута назаўтра?

Кастусь ХАДЫКА

Чытацкі дзённік Навума Гальпяровіча

Вяртанне ў маладосць

Перагортваў новую кнігу вершаў Віктара Шніпа, уваходзіў у знаёмы свет яго паэзіі, і раптам захацелася вярнуцца да яго першай тоненькай кніжачкі «Гронка святла», якую набыў у 1983 годзе ў наваполацкай кнігарні. Тады імя юнага Віці Шніпа было ўжо ў літаратурных колах на слыху, бо яго вершы перыядычна з'яўляліся на старонках беларускага друку, ён прымаў удзел у розных творчых сустрэчах разам са старэйшымі літаратарамі, пра яго вершы цёпла адзываліся мэтры роднай літаратуры.

І ў жыцці, і ў творчасці Шніп у той час выдзяляўся сваёй юначай непасрэднасцю, імкненнем знайсці трапны і нечаканы вобраз.

І першыя ж са старонак яго зборніка ярка гэта пацвердзілі:

Ранак абудзілі пілы,
Рэха блудзіць па тайзе.
Завірусе ссеклі крылы,
За аленямі паўзе.
На прасецы вецер вёрткі
Разаслаў снягоў абрус.
А якуцкія вавёркі
Коцяць сонца ў Беларусь.

Гэтыя вавёркі, якія коцяць сонца, завіруха, якая паўзе за аленямі — вобразы, якія раскіданы шчодра ў кнізе, яны і сёння характэрныя для яго паэзіі. А ў той час яны прываблівалі радасцю адкрыцця свету:

Першага снегу святло,
Ты для мяне, як свята.
Сонца памалу ўзыйшло
З коміна крайняй хаты.

Вецер сцяжыну маю
Ноччу замёў на лузе.
Ціха на ганку стаю,
Снег патушыць баюся.

Снег, сонца, дрэвы, воблакі для юнага паэта сталіся жывымі істотамі. Яны ўдзельнічаюць у яго жыцці як сябры, паплечнікі, суразмоўцы:

Пакінуў вецер
Два лісты у хаце:
Адзін ад бацькі,
А другі ад маці…

Як у кожнага пачаткоўца, у кнізе «Гронка святла» адчуваецца ўплыў папярэднікаў, духоўных настаўнікаў. Для Шніпа гэта відавочна быў Рыгор Барадулін, і гэтае жаданне знайсці трапны вобраз, параўнанне, пашукаць яркае адметнае слова перарастала ва ўласны почырк, у адметнасць, якая стала адзнакай далейшай творчай біяграфіі паэта.

Потым Шніп стане шчодра эксперыментаваць у форме, паспрабуе сябе ў самых розных жанрах. Але першыя крыху наіўныя радкі сталі тым падмуркам, якія вызначылі багаты творчы набытак сённяшняга вядомага майстра.

Магчыма, часам паэту бракуе ашчаднасці, бо не толькі колькасць напісанага вызначае ўзровень майстра, але гэта, я лічу, тое, чым была характэрная першая кніга — жаданнем выказацца, адгукнуцца словам на тое, што называецца паўсядзённым жыццём, мроямі, жаданнямі.

І сёння Віктара заварожвае, зацягвае гэтая стыхія, і ён у пастаянным руху ў бязмежнай паэтычнай прасторы, нястомны вандроўнік у свеце роднага слова. Але пра гэта хай пішуць крытыкі і літаратуразнаўцы.

Для мяне як чытача, зборнік «Гронка святла» на момант стаў вяртаннем ва ўласную маладосць, у тую пару, калі хораша марылася, шмат чыталася і пра многае думалася.

Іван КАПЫЛОВІЧ

* * *

Ці прайду да канца ўсю дарогу,
На якой спатыкнуся не раз.
Я ішоў скрозь туман і трывогу,
Крочыў я скрозь няпэўнасці час.

Невядомыя клікалі далі,
Каб пабачыцца з імі паспеў
Покуль дні мае спелі, чакалі,
Каб я час іх світальны сустрэў.

Пазбаўляўся сумненняў і тлуму,
Што збівалі з хады хуткі крок:
Выручалі, настройвалі думы,
Заручыцца якімі я мог.

Не адразу прайду скрозь ваганні,
Скрозь няпэўнасці дым і хаос:
Засяроджуся ў супрацьстаянні
З тым усім, што кранула мой лёс.

* * *

Ішоў у школу пехатою
Праз туманы і саснякі.
Ішоў адной дарогай тою —
Мяне даймалі скразнякі.

Мяне даймалі бездарожжа
І позняй восені слата,
Паспешных дум неасцярожнасць,
Іх блізарукасць, слепата.

Ішоў у школу я паводкай,
Калі дарогі не відно
На тым і думкі засяроджваў —
Што адбываецца са мной?

Я не вяртаўся з паўдарогі,
Калі збівалі з ног вятры.
Сваю настойлівасць падвойваў
І маладушна не хітрыў.

Адольваў я сумненні — скруху,
Адольваў сцюжную зіму.
І стому зведаў, і напругу.
І шляху верны быў свайму.

Даліся ў знакі тыя вёрсты,
Што да суседняга сяла.
Яны — дні роздуму і росту,
Дні набліжэння да святла.

* * *

Сірацінаю рос,
Скрозь пакуты ішоў.
Наглытаўся я слёз,
Ратаваўся імшой.

Хацеў свету спазнаць
І спяшаўся туды,
Каб надзею спаткаць,
З ёй ісці скрозь гады.

Каб прыйсці незнарок
Да сваіх гэтых дзён,
Што не знаюць дарог,
Дзе ёсць крыўды палон.

Мроіў я пра вясну,
Пра наступны свой дзень,
Ды баяўся — засну —
Мрояў час адыдзе.

Закалыхваю шлях
Сваіх мрояў даўно,
Каб сягоння, пасля
Явай стаў ён зямной.

* * *

Пачую жураўля
У восеньскім тумане,
І сумна раптам стане —
Асенні слаўся шлях.

На паплавах стагі
Успамінаюць лета,
І восені прыкмета —
Бусловыя кругі.

Апошняе цяпло
Маёй малой радзімы:
Час блізкі халадзіны,
Час шчодры на святло.

У сэрца йдзе туга
Мо ад кругоў бусловых,
Ад думак не вясновых,
Ад думак аб стагах.

Чырвоныя агні
Гараць на арабіне.
І вера не пакіне —
Другія ўбачу дні.

Кацярына МІЗЕРЫЯ

Да родных крыніцаў

Да родных крыніцаў,
да родных вытокаў,
Да роднае зоркі, што вабіць з нябёс,
Іду, ні на міг не спыняючы крокаў,
Прымаючы небам падораны лёс.

Да родных вытокаў,
натхнення крыніцаў,
Прыйду, абмінаючы горыч нягод.
Прыйду, каб надзеі сваёй
пакланіцца...
Каб светлых падзей закружыў карагод.

Да родных вытокаў....
Дзе ўсё пачалося,
Дзе першыя словы мне вецер шаптаў,
Мне спевы дзівосныя
чуць давялося...
Мне казкі чароўныя ён перадаў.

Каб потым памалу радок за радочкам
Я іх на паперу пакласці
змагла.
І спевы анёлаў зімоваю ночкай
Я, быццам дзіцятка,
у свет прывяла.

Каб потым усюды змагла
пакланіцца
Адзінай трывалай святыні сваёй.
Да родных вытокаў,
да роднай крыніцы —
Туды, дзе пануе адвечны спакой.

* * *

Заплюшчыць вочы на хвіліну
І моўчкі слухаць цішыню...
Пабачыць зорныя даліны
Свайго жадання не спыню.

Адчуць чароўны подых ветру
Пяшчоту восеньскіх дажджоў.
Бо ўсё жыццё я ў казку веру
І зорны шлях малюю зноў.

Заплюшчыць вочы на імгненне
І ў вечнасць знікнуць назаўжды.
І на шляху свайго збавення
Пакінуць лёгкія сляды.

Заплюшчыць вочы і забыцца...
Усё былое пазабыць.
На момант ціха растварыцца...
Дазвольце мне сабою быць!

* * *

Я больш за ўсё баюся цішыні
І больш за ўсё пачуць яе жадаю.
У ёй жывуць любові карані
І вернасці вытокі, і адчаю.

У ёй жыве цяпло маёй душы,
Маёй надзеі незямны агеньчык,
Што мне дагэтуль дазваляе жыць,
І боль нясцерпны вокамгненна лечыць.

У ёй жыве натхненне...
І туды
Вяртаюся я ў вольную хвіліну.
Каб зноў пакінуць там свае сляды,
Бо не пакінуўшы сляды —
загіну.

Без крылаў Мары не змагу ляцець.
А мне так трэба, лётаць я павінна!
Ніколі не адродзіцца нідзе
Маёй душы святая палавіна.

Я больш за ўсё баюся не пачуць
Анёла голас, шэпт яго з нябёсаў.
Я служкай быць паэзіі хачу,
Прымаць радок,
як падарунак лёсу.

І сярод гэтай вечнай мітусні
Я крок да шчасця смелы не спыняю.
Я больш за ўсё баюся цішыні
І больш за ўсё пачуць яе жадаю.

Надзея САЛОДКАЯ

Раднулька-крынічка

З падгорнай крыніцы бруіцца вадзіца —
Далонь апускаю сцярожка…
У люстра празрыстае
Вечнасць глядзіцца…
Ці ўспомніш мяне-ветраножку?

…Напоўніла вёдры, каромысел гнецца,
Хоць кроплю расплёскаць баюся.
Раднулька-крынічка мне лёсам даецца,
І я ёй на вернасць клянуся.

Я з прыгаршчаў п'ю
чысціню-прахалоду —
Смачней смакаты не бывае!
Прайшоўшы свой шлях
ад вытоку да сходу,
Дзіўлюся: крынічка жывая!

Пяшчотнай мелодыяй,
марай-уцехай
Душу ў паднябессе ўздымае
І памяць маю, паланёную рэхам,
Журчаннем шчымлівым гартае...

Шматгалоссе

Лічыць зязюля старанна гады,
Буркае голуб, пяюць амялушкі,
Дзятлы, шпакі, перапёлкі, дразды…
А салаўі!.. Вераб'і-паскакушкі…

Хтосьці прысвіснуў, другі рагатнуў,
Пошчак паслаў закаханым салоўка…
Гукі зліваюцца ў песню адну,
Славячы родны прыстанак-старонку!

Вухкае філін, а дзяцел дзяўбе,
Плач перапёлкі ўжо стаўся хранічным,
Клін жураўліны курлыча ў журбе,
Ну, а сарокам пляткарыць прывычна.

Што абяцаюць, узносячы крык,
Сумныя птахі, злятаючы ў далі?
Маніць зязюля, заблытаўшы лік,
Над чарнатою вясенніх праталін?..

Слухаю, чую і веру ўсяму,
Чым гэты свет мяне шчодра прывеціў,
Словы ўліваю ў яго сумятню —
Сёння пад вечар і ў заўтрашнім леце.

* * *

Цешуся, птушка настрой
мне падвысіла —
Цюкнула дзюбай сінічка ў акно,
Сум неспатольны сабою прыцішыла,
Вось і надвор'е ў тым з ёй заадно.

Ранак туманны прывеціўся сонейкам,
Вецер не лашчыць, але не раве.
Дзень пачынаецца роўна,
спакойненька,
Нешта харошае з ім наплыве.

Голас пачую, ці слова адкрыецца,
Можа, шкадобу ў сабе прытушу…
Станецца так — дык і сэрца
раскрыліцца,
Боль перастане трывожыць душу.

Птушка ў акенца не проста
так просіцца,
Знае вястуння, што сённяшнім днём
Дрэннае-шэрае ветрам адносіцца…
Добрую вестку нясе паштальён.

Я люблю гэты горад

Я люблю гэты горад —
ад болю ў суставах
Да пранізлівых вершаў, ён імі прапах.
Нешта ў ім ёсць ад юнай
яшчэ Прадзіславы
І ад мудрых дзядоў
на сустрэчных вятрах.

Паміж гукаў ціхуткіх і зычных
старонніх
Разліваецца спеў жыватворных званоў.
Тут ратуюць мяне лікі
свята-іконных
Мнагамудрых ягоных дачок і сыноў.

Я пяю і жалкую на гэтай прасторы,
Тут мой голас мацнеў,
з часам трохі ахрып…
Я люблю гэты горад у веснім уборы
І ў асеннім гарэнні каштанаў і ліп.

Светлай песняй сваёй па-над ім
я лунаю,
Да сябе тут дайшла
сярод нот і асця.
Я люблю цябе, Полацк!
Тут леты гартаю,
Ты сілкуеш мяне, ты мой існы працяг.

Пашчасціла

Апавяданне

Уладзімір ВАСЬКО

Мы пазнаёміліся выпадкова. Ён стаяў на супрацьлеглым беразе нешырокага возера і, паклаўшы вудзільна на прыбярэжную зляжалую кучу сухога галля, нацяганага з лесу бабрамі, сачыў за паплаўком. Я наравіў закінуць хвосцік з жыўцом у акенца між круглых лісцяў белых гарлачыкаў, што аздобілі водную гладзь, дзе шчыравалі краснапёркі.

Некаторы час мы стаялі моўчкі, хоць адлегласць паміж намі і дазваляла перакідвацца словамі.

Першым адазваўся ён:

— Курава няма?

— Ёсць.

— То я зараз прыйду.

— Прыходзь.

Губляючыся ў зарасніках арэшніку, ён даў невялікага кругаля і неўзабаве наблізіўся да мяне, нерашуча працягнуў руку.

— Ну што, не бярэцца?

— Ні адна яшчэ не ўчапілася. А во як гуляюць…

— Нічога, зараз пачнуць.

Я дастаў з пачкі цыгарэту і падаў яму. Другую закурыў сам.

— Часта бываеш тут? — запытаў ён.

— Не часта, але калі-нікалі прыязджаю. На веласіпедзе.

— Мусіць з палявой вёскі?

— З Гурыноў. Чулі такую?

— Ведаю. На тым беразе Нёмана. Кіламетры за чатыры адсюль?

— Так. Каля нас дык ні аднаго азерца, ні адной рачулкі. А рыбачыць хочацца. Вось і прыязджаю сюды, у Ліпічанскую пушчу.

— І правільна робіш. Тут месца для рыбалкі во якое! — ён павёў па кругу рукой. — Цэлы ланцуг азёр!

— Я ўжо аглядаў іх. Прыгожыя, чыстыя. Усе злучаюцца паміж сабой раўчукамі. І з Нёманам — таксама. Але мне найбольш падабаецца рыбачыць вось на гэтым. Тут водзяцца краснапёркі. Здатныя такія, з чырвонымі плаўнікамі. Іншы раз як пачнуць брацца… адна за адною, толькі нажыўку паспявай надзяваць.

— У крайнім возеры і самы ёсць. Вунь у тым, што забірае налева, убок ад сасняка. Калі-небудзь сходзім.

— А як жа! Абавязкова!

Над нашымі галовамі ціха шумеў ад лёгкага подыху ветрыка стары размашысты дуб з глыбокімі маршчынамі на кары. У возеры, марудна праплываючы, адлюстроўваліся белыя кудлатыя воблакі. Пахла аерам, адчуваўся водар лясных траў. Мясціна тут даволі экзатычная, прывабная. Берагі тупкія, мурожныя. Наўсцяж аж да Нёмана растуць магутныя старасвецкія дубы, пакідаючы між сабой лапінкі сенажацяў. На некаторых дрэвах здалёк бачны бусліныя гнёзды, да якіх час ад часу, плаўна вяслуючы крыламі, ляцяць чырвоногія веліканы. У іншых месцах да азёр блізка падступае стары сасновы лес.

— Што, мусіць, нідзе не працуеш, што днём на рыбалку прыехаў? — запытаў ён, скінуўшы мізінцам попел з цыгарэты.

— Чаму? Працую ў Лідзе на мясакамбінаце, у каўбасным цэху.

— Майстрам?

— Дзе там… Рабочым. Зараз у водпуску. Да бацькоў прыехаў.

— Жанаты?

— Халасцяк. Стары халасцяк.

— Трэба жаніцца, а то зараз пераспееш…

Я пачаў прыглядвацца да гэтага сярэдняга росту чалавека, крыху флегматычнага, з дабрадушным выразам твару. Было штосьці знаёмае ў яго абліччы.

— Ці не сустракаліся мы дзе-небудзь? — спытаў я.

— Не помню. Я працую тут лесніком. Арсень мяне завуць. Усё магло быць…

— Ага, успомніў. Мы з бацькам везлі дровы з лесу, сухастой. А ты нас запыніў і давай чапляцца.

— Не дужа прыставаў?

— Усё трапятаўся каля воза і крычаў, чаму не выпісалі.

— Але адпусціў?

— Махнуў рукою і сказаў: «Ладна, едзьце».

Я глянуў на паплавок — ён імгненна схаваўся пад вадой. Я рэзка рвануў вудзільна ўгору — у паветры затрапяталася важкая таўставатая краснапёрка.

— Ну, можа зараз пачне, — сказаў Арсень, — пайду і я да сваёй вудачкі.

І ён няспешна паплёўся вакол возера.

Прыкметна сцішылася. Лісце на дрэвах перастала шапацець. Сонца пакінула зеніт і пахілілася на захад. Я паглядзеў у бок Арсеня — у яго таксама пачало кляваць.

Налавілі мы з ім плоткі ў той дзень больш, чым па тры кілаграмы. Перад развітаннем зноў сышліся.

— Дай яшчэ адну, — папрасіў ён.

Я дастаў цыгарэту і падаў. Ён прыкурыў і сказаў:

— А-а… гэта не рыбалка. Давай заўтра сходзім на сома.

— Не пярэчу. Дзе сустрэнемся?

— Над тым возерам.

Арсень паказаў указальным пальцам.

Назаўтра Арсень прыйшоў не адзін, а з дзяўчынай, вабнай. У руках ён трымаў два шнуры з крукамі і курыцу з адсечанай галавой.

— Віка, — звярнуўся ён да дзяўчыны, — назбірай галінак і падсмаж курыцу.

Дзяўчына, пружыніста перабіраючы ножкамі, пашыбавала пад сосны, пад якімі валялася сухое голле, з рыжымі іголкамі.

— Што, курыцу будзем есці? — спытаў я.

— Ды не. Гэта прынада для самоў. Яны плывуць на пах смажанай курыцы.

— А-а… І дзяўчыну прывёў з сабою… Сваячка ці з адной вёскі?

— Мая пляменніца. Кандытарам працуе ў Мастах. Зараз, як і я, у водпуску і пажадала ісці разам са мною на рыбалку.

— Займальна.

Неўзабаве вярнулася Віка з бярэмем сасновых галінак. Яна, прысядаючы на кукішкі, спрытна раскладвала дровы, змяшчаючы пад ніз галінкі з іголкамі. Пасля ўстала, паправіла салатавую, у абцяжку, міні-сукенку і падышла да нас.

— Запалкі ёсць? — чамусьці звярнулася яна да мяне, а не да свайго дзядзькі.

— Маю.

Я дастаў з кішэні пачак і працягнуў дзяўчыне. Віка, беручы запалкі, кончыкамі пальцаў дакранулася да маёй рукі — і нешта зайграла ў мяне ўнутры. Я перастаў слухаць Арсеня, а пазіраў ёй услед, паглядзеў, як Віка далікатна чыркнула запалкай і падсунула агеньчык пад сухія іголкі. Галінкі імгненна ўспыхнулі — і полымя ахапіла ўсе дровы. Арсень падняў з травы маленькую курыцу і кінуў у агонь — пах паказытаў нам ноздры.

У прыродзе панавала цёплае зацішша. Каля берага ў вадзе нават не ўздрыгвала асака, не варушыўся стройны трыснёг, не лепятала на дубах свежае лісце. І на душы было па-святочнаму чыста, светла.

Віка зноў прысела на кукішкі і канцы падгарэлых галінак асярожна пачала падсоўваць да сярэдзіны. Пасля ўстала і прыцікам перавярнула курыцу на другі бок.

— Не можа быць, каб самы не клюнулі на такога жыўца, — самаўпэўнена прамовіў Арсень. — Гэта для іх смаката…

— Паглядзім, — сказаў я. — Каб не пайсці дамоў з пустымі рукамі...

Віка стаяла і толькі пяшчотна ўсміхалася, пазіраючы то на мяне, то на свайго дзядзьку.

Нарэшце курыца падсмажылася. Арсень сукаватай галінкай выкінуў яе з кастра і адкаціў далей ад вогнішча. Даў астыць. Пасля дастаў з кішэні ладны сцізорык і разрэзаў птушку на дзве палавіны, выскраб вантробы і ўкінуў у возера:

— Самы і гэта з'ядуць.

Адну палавіну тушкі Арсень з веданнем справы надзеў на адзін крук, а другую — на іншы.

— Цяпер размахвайся і кідай далей ад берага, — загадаў ён мне. — Толькі не ў адно месца, а ў розныя.

Я ўзяў шнур непадалёку ад жыўца, пакруціў у паветры і шпурнуў — курыца шлёпнулася амаль на сярэдзіне возера. Тое самае зрабіў і з другім шнуром. Свабодныя канцы вяровак мы навязалі на калы, увагнаныя ў зямлю.

— Цяпер будзем чакаць, — заспакоіўся Арсень.

Я паглядзеў на Віку і прыкмеціў, з якой цікавасцю дзяўчына пазірае на нас, на возера. Тут жа падумаў: патрэбна ўзяць яе адрас, спачатку завязаць перапіску, а там будзе бачна.

Вочы і твар Вікі выпраменьвалі прывабнае дзявочае святло і натуральнае душэўнае замілаванне ўсім — і я не ўстрымаўся:

— Дрэнна, што ты жывеш у Мастах, а не ў Лідзе… А так мы сустракаліся б…

— Бяда не вялікая…

— Я хачу напісаць табе любоўнае пасланне.

— Ого! І на колькі лістоў?

— На агульны сшытак.

— Жах! Дык я ж яго і за месяц не прачытаю… І пра што ты там будзеш пісаць?

— Знайду пра што… Патрэбен адрас.

— Забаўна. Ну раз на агульны сшытак, то запісвай.

— У мяне няма ні аўтаручкі, ні паперы.

— Тады запамінай. Горад Масты, вуліца Міхася Васілька, дом № 1. Я жыву на кватэры ў прыватным доме. Атрымаю.

— А прозвішча?

— Медуніца.

— Што?! Медуніца?! Кветка медуніца?! Дык вось жа яна расце каля альховага кусціка.

— Прынясі мне.

Я адлучыўся і прынёс парастак гэтай расліны з белавата-ружовымі кветачкамі.

— Пакаштуй, якія салодкія.

Віка адрывала іх і смактала:

— Сапраўды, як мёд. І пахнуць мёдам. А я і не ведала…

Пульхныя вусны дзяўчыны яшчэ больш пачырванелі:

— Не забыўся адрас?

— Помню.

Арсень стаяў збоч і маўчаў. Самы, пра якіх я ўжо і забыўся, і не збіраліся кляваць на кураціну. Рэшткі скручаных на беразе шнуроў не расцягваліся, не выпрамляліся, але гэта мяне зусім не хвалявала.

І тут Арсень, абмераўшы мяне позіркам і нібы правяраючы, што мне перадалося ад бацькоў, які ў мяне характар, запытаў:

— Не сварыцца твая маці з бацькам?

— Не, — адказаў я. — Калі, бывае, паспрачаюцца па бытавых дробязях. А так жывуць дружна.

— А во ў нашай вёсцы ёсць адна сямейка — не пазайздросціш… Жонка есць мужа поедам, грызе, калі ён аказваецца побач. Гаротнік, той затыкае ватай вушы, летам і зімой ходзіць у зімовай шапцы з апушчанымі вушамі, з падвязанымі пад барадой каснікамі. І ноччу спіць у той жа шапцы. Яна крычыць, бэсціць яго, папракае за ўсё, а ён маўчыць, бо нічога не чуе.

— Вяроўка раскручваецца! — ускрыкнула Віка. Арсень кінуў свой аповед і ўхапіўся за шнур.

— Здаровы! Дапамагай!

Я таксама ўхапіўся за шнур і, перабіраючы рукамі, мы цягнулі ўлоў да берага. Сом (а гэта, пэўна, быў ён) кідаўся з аднаго боку ў другі, супраціўляўся, валтузіўся, аднак мы, упіраючыся нагамі ў цвёрды грунт, не давалі рыбіне паслаблення. І неўзабаве вывалаклі яе з вады. Зацягнулі далей ад берага, каб не сарвалася і не ўцякла.

Сом, буйны, дужы круціўся на траве, шукаючы выйсця.

— Не менш трох пудоў будзе, — прыкінуў Арсень. — Вось гэта ўлоў. Не тое, што нейкія там краснапёркі…

Мы з Вікай упершыню бачылі такога сама і не хавалі свайго здзіўлення і захаплення. Ён яшчэ ніколькі не аслабеў, і, каб не шнур з круком, няпроста было б перакрыць яму дарогу да возера.

— У цябе, Віка, ногі, як два самы, — раптам сарвалася ў мяне з языка.

— Жах! Ну і знайшоў параўнанне… За такое параўнанне можна і пакрыўдзіцца.

— Прабач. Я не хацеў. Проста мільганула такая думка ў галаве і выскачыла адразу. Не паспеў стрымаць.

Віка апусціла вочы, прамаўчала. Сом прыкметна аддаляўся. Прыйшлося зноў узяцца за шнур і падцягнуць рыбіну на ранейшае месца.

Між тым, мне неабходна было ўжо ехаць дамоў: бацька наказваў, каб да абеду прыехаў, бо на сенажаці нас чакала сухое сена. Я сказаў пра гэта Арсеню.

— Едзь, — адказаў ён. — Раз трэба, то трэба…

Нарэшце сом спыніў сваю валтузню, застыў на месцы. Арсень прынёс рагаціну і падаў мне:

— Пары горла, крук трэба дастаць.

Я адчуў, што крук паддаўся, пацягнуў шнур — і ён выскачыў вонкі. Сом не варушыўся.

— Што будзем рабіць? — запытаўся я. — Рассякаць напалавіну? Альбо забірайце вы з Вікай усяго.

— Не, — адказаў Арсень. — Забірай ты. Цэлага. Мы з Вікай, можа, зловім яшчэ аднаго.

Ён адвязаў шнур ад крука і сказаў:

— Ім прывяжам сама да рамы. Калі-небудзь аддасі…

Я прыцягнуў з-пад дуба веласіпед. Віка трымала яго за руль, а мы з Арсенем узгрувасцілі сама на раму. Прывязваць яго было нязручна: саслізгваў, падаў. І тады Арсень узяў рыбіну за галаву і працягнуў разам з часткай тулава між ручак веласіпеда. Цяпер стала лепш: Віка трымала сама за хвост, Арсень за тулава, а я ўвіхаўся са шнуром. Прывязаў да рамы туга, моцна, так што можна было не хвалявацца і спакойна цягнуць веласіпед з паклажай дахаты.

На развітанне я паціснуў руку Арсеню, паглядзеў у вочы Вікі.

— Напішаш ліст? — запытала яна.

— Не замаруджу. Прыеду ў Ліду і адразу напішу. Толькі куды мне высылаць пісьмо — у Масты ці ў вёску?

— У Масты.

* * *

Між намі завязалася непрацяглая перапіска, пасля мы перайшлі на перагаворы па мабільніках, некалькі разоў я ездзіў да яе на вуліцу Міхася Васілька. Пад восень мы пажаніліся. Віка пераехала ў Ліду і ўладкавалася ў сталовую будтрэста № 19.

І вось аднойчы мы паехалі ў яе вёску. Частаваліся спачатку ў яе бацькоў, а пасля зайшлі ў госці да Арсеня. Той на шырокую нагу адзначыў сустрэчу. Я перадаў яму шнур і падзякаваў за сама. Пакуль Віка размаўляла з яго жонкай на кухні, мы выйшлі на двор перакурыць.

— Ну як, Арцём, не ў зімовай шапцы спіш ноччу? — спытаў Арсень.

— Не, сплю без шапкі. Мы з Вікай самыя шчаслівыя ў свеце. Мы як адно цэлае.

У кожнага свая зорка

Ёсць у беларусаў прыказка, якая даволі часта ўжываецца. Праўда, часцей у варыянце блізкім да рускамоўнага. Як быццам нічога незвычайнага. Абодва падобныя па сэнсе: «Яблык ад яблыні далёка не падае». Хоць, бадай, лепш сказаць: «Яблык ад яблыні недалёка коціцца». Між іншым, у нас ёсць і адпаведнікі, якія не толькі сведчаць аб сказаным, а і даюць яму новыя адценні. Напрыклад, «Якая матка, такое й дзіцятка». Ці «Якое дрэва (які целяш, дуб, явар), такі клін, які бацька, такі сын». Не горш гучыць і «Якая хатка, такі і тын, які бацька, такі і сын», «Які млын, такі і ставок, які бацька, такі і сынок».

У рускамоўным варыянце, праўда, як і ў беларускім, усё зводзіцца да таго, каб засведчыць, што дзеці часам атрымліваюць у спадчыну далёка не самыя лепшыя якасці іх. Найперш — сыны. У гультая да працы з'яўляюцца неахвотныя да яе, у п'яніцы — да чаркі здатныя. Назіраюцца і іншыя негатыўныя якасці. Чамусьці забываецца, як пры жаданні можна прывесці нямала процілеглых фактаў: «Калі ў сям'і лады, дык ніякай бяды». «Нашчадкі вырастаюць годнымі тых, хто даў ім жыццё». Найлепшае пацвярджэнне правільнасці такой думкі — жыццё паэта Аркадзя Гейнэ.

Яго бацька Андрэй Хрыстафоравіч нарадзіўся 22 студзеня 1886 года ў Ліепаі, сённяшнім партовым горадзе на заходнім узбярэжжы Балтыйскага мора ў Латвіі. У партыю ўступіў ў 1917-м. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі стаў старшынёй батальённага камітэта на Заходнім фронце. Калі адбылася Кастрычніцкая, усталёўваў савецкую ўладу ў Бешанковічах і Лепелі. Потым быў актыўным барацьбітом з контррэвалюцыйнымі бандамі ў Лепельскім павеце, а таксама ў Сенненскім і Віцебскім. Знаходзіўся на савецкай і гаспадарчай рабоце не толькі на Віцебшчыне, а і ў Мінску. У 1924—1925 гадах быў членам Цэнтральнага камітэта БССР. Памёр 2 лістапада 1964-га. Лёс, як бачым, быў да яго літасцівы. Не мог не радавацца, што сын Аркадзь падрастае вартым яго. Аднаго не ведаў: Гасподзь адмераў яму ўсяго 23 гады.

Нарадзіўся 10 студзеня 1919-га ў Бешанковічах. Паэзіяй захапіўся вельмі рана, надрукаваўся таксама. Першы верш «Бальшавіцкая вясна» газета «Піянер Беларусі» змясціла 11 красавіка 1934 года. Звяртаўся і да іншых жанраў. У 1938-м паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі. Працаваў у рэдакцыях газет. Пісаў рэцэнзіі, артыкулы, выступіў з апавяданнем «Выпадковая сустрэча», вершам для дзяцей «Слязінка». Аднак па-ранейшаму ў асноўным вабіла паэзія «дарослая». Найлепшыя з вершаў увайшлі ў кнігу «Шчаслівая зорка» (1939).

Узрадаваўся свайму першынцу. Далёка не кожнаму ўдаецца надрукавацца ў 20 гадоў. Вабіла зялёная вокладка, як тая маладзенькая лістота на пачатку вясны. Пяцікутная зорачка на ёй быццам клікала да сябе. Назву зборніку даў аднайменны верш. Ён цікавы тым, што ў ім Аркадзь Гейнэ здолеў «даць узор сапраўднай лірыкі, злілося пачуццё кахання з пачуццём любові да Радзімы» (Ірына Багдановіч). Пра тое пісаў, чым сэрца поўнілася:

Помніш, летняй ноччу цёмна-сіняю —
Шчаслівейшай нашаю парой —
Слухалі мы песню салоўную
У зялёным садзе пад ракой.

Закаханыя, хоць аб гэтым у вершы і не гаворыцца, мараць аб сваім далейшым лёсе. Прыгадваюць, што

Аркадзь Гейнэ.

«У народзе ёсць павер'е гэткае, // Быццам мае кожны чалавек // Зорку ў небе, для яго прыметную, // І яе жыццё — ягоны век…» Захацелася пасля гэтага ўспамінку і сабе «выбраць шчаслівейшую, найлепшую зорку». Лірычны герой пытаецца ў дзяўчыны, дзе гэтая зорка знаходзіцца: там, «дзе ляжыць вялікі Млечны Шлях, // Або там, дзе зорная Мядзведзіца». Аказалася, што іх вабіць толькі адна:

Ты зірнула ў ночы даль маўклівую
І сказала:
— Не, не адгадаў;
Выбрала я самую шчаслівую,
Што ў Крамлі…
І выбар наш супаў…

У гэтых словах — святое праяўленне любові да Радзімы. Гэтым вершам, а таксама творам «Песня дзяўчыны» Аркадзь Гейнэ прадстаўлены ў калектыўным зборніку «Крывёю сэрца», калі ў 1967 годзе выдавецтва «Беларусь» пачало выхад «Бібліятэкі беларускай паэзіі». Яны змешчаны і ў другім томе «Анталогіі беларускай паэзіі» ў трох тамах. Укладальнікамі іх з'яўляюцца адпаведна Анатоль Вялюгін і Алег Лойка, у мастацкім гусце якіх сумнявацца не даводзіцца. А на гэтых творах яны запынілі ўвагу не выпадкова. З'яўляючыся водгукамі на тагачасныя падзеі, вершы яскрава сведчаць аб любові да сваёй Радзімы. Яна з нападам гітлераўцаў на Савецкі Саюз і прывяла да па-сапраўднаму свяшчэннай вайны.

«Песня дзяўчыны» напісана як споведзь той, якая страціла свайго любага — ён «загінуў у бойцы са славай». Відавочны баладны пачатак. Даведаўшыся пра яго смерць, яна спяшаецца на тое месца:

Ты ляжыш і не ўстанеш ніколі,
Згас твой погляд навек малады.
Галаву апусціўшы, па волі
Ходзіць сябра твой — конь баявы.

Я каня асядлаю з любоўю,
Я прачышчу вінтоўку тваю,
І — расплоцяцца ворагі кроўю
За цябе ў наступным баю!..

Затое верш «Дождж» настолькі шчыры, нібы наяву вяртаешся ў маладосць юнакоў і дзяўчат той пары. Сітуацыя ў нечым знаёмая: «…пайшоў адразу, як на ліха, // Вялікі дождж». Толькі схаваўся юнак пад «самым тоўстым дубам», як да яго «падбегла з лёгкасцю птушынай <…> невядомая дзяўчына». Што нельга хавацца пад высокімі дрэвамі, праўда, тады ніхто не гаварыў. Аднак гэта, скажам так, проза жыцця. А вось паэзія:

Прыкмеціў я: як вочы, вочы,
Як на рысунку, стан дзявочы…
Раптоўна — вецер! Дожджык коса
Лінуў, ды прама ёй на косы.
Яна ўсё больш і больш налева,
І так кругом абходзіць дрэва.
І мы сышліся блізка надта…
У гэтым дожджык вінаваты…

Што ў літаратуры Аркадзь Гейнэ быў чалавекам не выпадковым, сведчыць яго жаданне разнастаіць жанравую тэматыку сваіх твораў. Два з іх напісаны ў жанрах, да якіх іншыя аўтары толькі падступаліся. Адзін — «Кітайская легенда» — стаіць каля вытокаў беларуска-кітайскіх літаратурных сувязяў. Сам па сабе ўжо цікавы зварот да гісторыі аднаго з самых старажытных народаў на зямлі. Не менш істотна і іншае. Аркадзь Гейнэ, адштурхоўваючыся ад кітайскага фальклору, прадказвае жыхарам гэтай краіны вялікую будучыню. Выступае як бы празорцам. Глядзіць на яе вачыма іх саміх. Нібыта прадпасылак для гэтага доўгі час не было. Не забылася і паданне пра тое, што «дракон чатырохгаловы» пазбавіў Кітай сонца:

Ёсць легенда ў кітайскім народзе,
Як зямля і сонца старая.
І сівыя дзяды ўнукам
Той легенды гавораць словы:
Як панёсся страшэнны грукат,
Як дракон чатырохгаловы,
Заравеўшы з усёю моцай,
Праглынуў сваёй пасткай сонца.
І зямля, апранутая змрокам,
Станавілася нежывою…

На шчасце, з гэтага нічога не атрымалася. Усё адно «ходзіць сонца высока // Над вялікай кітайскай зямлёю, // І народу праменямі свеціць, // І цяплее яно штодзённа…» Хоць не здаюцца і тыя, хто хоча гібелі гэтаму працавітаму народу: «Толькі маюць яго на прымеце // Кіпцюры самурая-дракона». А завяршалася балада перакананнем:

Будзе час — і ўдаль пакаленняў
Пройдуць новай легенды словы:
Як згарэў ад гарачых праменняў
Той дракон самураягаловы…

Ад такога завяршэння яе больш глыбокім сэнсам напаўняецца пачатак: «Прамяністае сонца ходзіць // Над вялікай зямлёй Кітая…». Гэта тое, што, як быў перакананы Аркадзь Гейнэ, абавязкова адбудзецца. Так і сталася.

Водгукам на падзеі ў Іспаніі прагучала «Балада аб Ліне Одэн». Паўліна Одэна Гарсія (вядомая і як Ліна) — генеральны сакратар арганізацыі «Камуністычная партыя Каталоніі». Жыццё яе абарвалася ў 25 гадоў. 14 верасня 1936-га, на аўтамабілі, заблудзіўшыся, трапіла ў лагер, заняты фалангістамі. Каб пазбегнуць арышту, скончыла жыццё самагубствам.

Апавядаючы пра Ліну Одэн, трагізм і героіку падзей, у якіх яна з'яўлялася актыўным барацьбітом, Аркадзь Гейнэ не проста падае любоў да той, каго байцы назвалі іспанскай Жаннай Д'Арк. Захапляючыся ёю, падкрэслівае непахіснасць Ліны Одэн у барацьбе з фашыстамі:

Высокая, стройная, ў сіняй блузе,
З рашучасцю погляд узнят.
І пальцы напружанай,
моцнай хваткай
Звыкла сціскаюць прыклад.
……
На грэбні акопа ўставала з гранатай
Насустрач таму, хто паўзе,
І куля не брала, нібы шкадавала,
Дзявочых пругкіх грудзей.

Не здагадваючыся пра ўсе абставіны гібелі гераіні — адкуль яму было ведаць, калі вядомы толькі фінал яе жыцця, адмовіўся ад канстатацыі таго, што яна заехала ў лагер фалангістаў на аўтамабілі. Нібы лазутчык, Ліна Одэн імкнецца да пастаўленай мэты, а яна адна — выведаць як мага больш звестак пра ворага.

Яе вылазка пададзена так праўдзіва, што ўсе дэталі адлюстравання як бы перад табой. Уяўляеш, як «Маўклівая ноч пралягла на схілы // Высокіх горных хрыбтоў… // Цішком прапаўзла бясстрашная Ліна // Ў раёны аванпастоў». Наступае той момант, калі шкадавання няма і быць не можа. Ці ты ворага знішчыш, ці ён цябе. Паказаўся п'яны фашыст: «— Сен'ёра, хадземце са мной… // І у адказ — стрэлам адразу // Ўзарваўся начны спакой». Потым «з'явіўся другі за ім. // Ў цвёрдай руцэ ускінуўся маўзер, — // І той не застаўся жывы». Не здавалася Ліна Одэн да апошняй кулі ў маўзеры, а пасля «націснула спуск рука».

Ёсць у баладзе яшчэ адна страфа:

Цёпла прылашчыў твар яе вецер,
Ціха праймчаўся над ёй…
Яна здабыла ў вяках бессмяротнасць
Смерцю слаўнай сваёй…

Яна, безумоўна, лішняя, бо і так усё сказана. Тут прысутнічае ярка выяўлены дыдактычны пачатак. Хоць Аркадзя Гейнэ можна зразумець. Патрыёт і паэт, ён ахвотна пісаў пра тое, што яго ўражвала. Таму і ўзяўся асэнсоўваць подзвіг Ліны Одэн, бо падзеямі ў Іспаніі жыла ўся краіна.

Пісаў і пра гераічныя рэаліі, звязаныя з блізкай яму рэчаіснасцю. Як у вершы «У дазоры». Герой твора пагранічнік Мікіта Карацупа і яго чатырохногі сябра Індус, з якім ён не аднойчы затрымліваў парушальнікаў граніцы. Рэальны факт стаў асновай і для напісання верша «Песня пра героя». Васіль Баранаў, таксама абаронца граніцы, быў узяты ў палон японцамі. Яны доўга яго катавалі, але той стойка вынес усе выпрабаванні і загінуў героем.

Ёсць у Аркадзя Гейнэ і верш «Мара», у якім аўтар задумваўся над тым, ці ёсць жыццё на іншых планетах: «Зоркі бліскаюць Шляху Млечнага // І таемнасцю вабяць мяне. // Я на іх паглядаю і думаю: // Вось у гэты жа самы час // Марсіянін з такою ж думкаю // Пазірае, быць можа, на нас». Атрымліваецца, што Аркадзь Гейнэ стаяў і каля вытокаў касмічнай тэмы ў беларускай паэзіі. Дарэчы, не адзін ён. Не мог паэт не чытаць верша Аркадзя Куляшова «Астраном». Пішучы яго, Аркадзь Аляксандравіч адштурхоўваўся ад таго, што не толькі ўсё жывое на зямлі ўзаемна звязана, але існуе цесная сувязь з Сусветам.

Натуральна, магчымасць жыцця на іншых планетах хвалявала і навукоўцаў. Як Аляксандра Чыжэўскага, ураджэнца мястэчка Цеханавец колішняй Гродзенскай губерні. Да ўсяго маляваў, пісаў вершы. Ёсць у яго і твор, сугучны прамоўленаму паэтамі. Напісаны ў 1919-м, ён быў апублікаваны толькі ў 1995 годзе. Яраслаў Галаванаў прывёў яго ў сваёй прадмове да кнігі Аляксандра Чыжэўскага «На берагах Сусвету. Гады сяброўства з Цыялкоўскім». У гэтым вершы ёсць і такія радкі: «О, целый мир грядет из тьмы — // Непостижим, не познаваем, // И если мыслят марсиане, // Так они мыслят, как и мы».

Жыццё малодшага лейтэнанта Аркадзя Гейнэ, які камандаваў узводам 66-й механізаванай брыгады, абарвалася ў баі пад Сталінградам. Яго «песня салоўная» змоўкла назаўсёды 16 снежня 1942 года. Свой вечны спачын знайшоў ў пасёлку Верхнякумскі Валгаградскай вобласці, што ў Расійскай Федэрацыі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

В’етнамскія вершы супраць… Звона Свабоды

Успамінаючы Уладзіміра Карызну, звычайна называюць яго выдатным нацыянальным паэтам-песеннікам, адным з аўтараў Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь. Аднак не заўважаюцца творы, напісаныя пасля наведвання В’етнама, калі ён толькі аднаўляўся пасля амерыканскай агрэсіі, ды і саміх ЗША. Па змесце яны, вядома, рэзка палярныя. У першых з іх боль і гора ад страт спалучаецца з ўпэўненасцю, што такую цудоўную краіну ніколі не скарыць. А, умоўна кажучы, амерыканскі сшытак — расчараванне ад убачанага, бо неаднойчы пераконваўся, што на справе ўсё далёка не так, як падаецца. Але і першыя, і другія вершы суседнічаюць, прынамсі, у яго кнізе «Доля Русь наша Белая», што ў 2007 годзе выйшла ў серыі «Беларуская паэзія XX стагоддзя» выдавецтва «Мастацкая літаратура». Падобнае суседства з’явілася невыпадкова. Гэта ў пэўнай ступені і водгалас на тое, што будучы паэт перажыў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Калі пачалася вайна, быў зусім малы. Аднак штосьці запомніў сам, нешта ведае з аповедаў блізкіх: «Бацька быў у партызанах, а мама берагла трох дзяцей. Хапіла ўсякага гора: былі заложнікамі, мерзлі ў балоце ў час блакады. Мне, старэйшаму, было каля чатырох гадоў, а малодшай сястрычцы — усяго толькі год… Цудам засталіся ў жывых». Уратаваў лес, як і многіх дзяцей вайны:

Я помню: партызанская зямлянка,
Аж да вачэй зарыўшыся ў зямлю,
Адводзіла ваенныя маланкі,
Што цэліліся ў партызанскую сям’ю.

Калі фашысты лезлі ў час блакады,
Ішлі аўчаркі нас пералавіць —
Лясным мы нетрам вельмі былі рады!
Той час успомню — сэрца забаліць.

Лес, горы ратавалі і многія в’етнамскія сем’і. Толькі не ўсе знайшлі там паратунак. Гінулі не толькі са зброяй у руках, бо краіна, як і Беларусь, па сутнасці стала «партызанскай рэспублікай». Амерыканскія акупанты нічым не адрозніваліся ад гітлераўскіх галаварэзаў. На ўвесь свет прагучала трагедыя, што адбылася ў вясковай абшчыне Сангмі. У 1968 годзе былі забітыя 594 жыхары з трох вёсак. З іх 210 дзяцей. Многіх перад гэтым катавалі, а жанчын гвалцілі. Сангмі стала крывавай сястрой Хатыні. У вершы «Упала слязіна» гэта засведчыў Пятрусь Макаль: «Аднолькава мова няўмольнай бяды // Гучыць у Санамі (так назваў ён гэтую вёску. — **А. М.**) і ў Хатыні».

Уладзімір Карызна, чуўшы ад в’етнамцаў пра зверствы, таксама не мог не ўзяцца за гэтую балючую тэму. І таксама ўжо ў назве верша параўнаў дзве сястры-пакутніцы, размешчаныя ў розных кутках планеты, паміж якімі не адна тысяча кіламетраў — «Покліч Хатыні і скарга Сангмі». Усё зразумела: зверствы нацыянальнасці не маюць. Стваральнікі «новага парадку», дзе б яны ні жылі — у Германіі ці ў ЗША — блізнюкі-браты. Таму сумленныя людзі, нягледзячы на тое, грамадзянамі якой краіны з’яўляюцца, памятаюць пра злачынствы, што даўнасці не падлягаюць.

Паэт накіраваўся ў В’етнам з мяшэчкам зямлі, узятай у Хатыні. Каб многае там пабачыць, у нечым для Беларусі нязвыклае, ды абавязкова пакланіцца зямлі Сангмі. Па вяртанні дамоў, калі ўзяўся за напісанне верша, зразумеў: час прайшоў, а тыя пачуцці, якія перажыў, нязменныя. Што гэта споведзь са слязьмі на вачах, відаць па радках, якія абпальваюць нясцерпным душэўным болем.

Плача душа, надрыўна плача, бо мёртвых заўсёды шкада, а нявінна забітых — тым больш. Ён, плач гэты, яшчэ больш невыносна цяжкі, калі гінуць ні ў чым не вінаватыя людзі, ахвяры ваенных злачынцаў. Гаворачы пра жыхароў Сангмі, Уладзімір Карызна дасягае таго высокага ўзроўню паэтызацыі, калі нібы ўвачавідкі бачыш не толькі іх. Перад табой быццам увесь працавіты в’етнамскі народ — працавіты, дружны, міралюбівы: «Сяло, // што рыбак, // па калена стаяла ў вадзе, // Над рысам схілялася, // смакавала бананы. // Люд працавіты // не чапаў нікога, // нідзе. // У лотас бялюткі // Навек закаханы». І тут з’явіўся «на зямлю Сангмі // з бандай сваёй // Лейтэнант Колі». На досвітку, калі ўсе спалі. Калі «такія салодкія сны», а пра бяду не думаецца.

Тое, што адбылося, не для слабанервовых. Аднак не перадаць такое нельга. Ды і нават злачынна недапушчальна. Гэта неабходна для таго, каб больш людзей ведалі, на што здатныя амерыканскія захопнікі: «фотаздымкі // на памяць // сабе і бацькам рабілі, // Смехам, // як ватай, // спакойна // напхаўшы раты». Ды гэта не ўсё:

І раптам —
голас жаночы:
— Дзе мае дзеткі?..
Ай, ай!
Злавілі кабету,
Кінжалам
выпаралі вочы
І пусцілі:
бяжы
Сваіх шчанят шукай.

Злачынствы амерыканцаў у Сангмі — гэта і прыклад таго, на што здатныя нелюдзі, гатовыя сябе ўявіць звышлюдзьмі, якім усё дазволена. Яны нічым не адрозніваюцца ад нямецкіх нацыстаў, якія палілі вёскі ў Беларусі. І тыя, і другія — сапраўдныя варвары XX стагоддзя. Філасофскай напоўненасцю вызначаецца верш «***Думаю, навошта запалкі людзям?» Да развагі як бы падштурхоўвае эпіграф, узяты з аднаго з вершаў Максіма Танка: «Якому дурню свет далі зрабіць, // Які мы ўсё жыццё перайначваем». Разважаючы на гэтую тэму, паэт таксама задаецца пытаннем: «Думаю, навошта запалкі людзям?» Адказ афарыстычны: «Хай бы кожнаму служыў // Агонь свайго сэрца: // Няма яго — мерзні». З гэтага шэрагу і яшчэ адно сцверджанне: «Няхай бы ежай была // Карысць, // зробленая адзін аднаму, — // Цікава, // колькі б балбатуны пратрымаліся?» Хоць самы важны гэты адказ:

А калі б свяцілам былі думкі:
Светлыя — светла,
Цёмныя — цёмна, —
Многія б так і не ўбачылі
Весняй красы
і нябеснай сіні.
Але, пэўна,
не ведаў бы свет тады
Трагедый Сангмі і Хатыні.

Ды агульнавядома, што цемрашамі валодаюць іншыя думкі: знішчэння большасці чалавецтва дзеля свайго панавання. Дзеля скарачэння колькасці людзей вышукваюць новыя і новыя спосабы. Як сказана ў прысвячэнні да верша «Сустрэча», «абшчыну Куці цемрашалы поўнасцю спалілі напалмам». Нічога не скажаш: «цывілізаваны» падыход. Як не зразумець боль, які і праз гады застаўся пякельным: «Я гавару з в’етнамскімі сябрамі, // І, як агонь, // Гарыць ува мне // іх лёс».



Адзін са сваіх вершаў, напісаных пасля вяртання з гэтай краіны, Уладзімір Іванавіч так і назваў — «В’етнамскім сябрам». Прамоўлена шчыра. Зусім не творчая справаздача, якія, як бывалі выпадкі, з’яўляліся пасля доўгіх камандзіровак, тым больш далёка ад Беларусі, з жаданнем засведчыць, што нездарма ў дарогу збіраўся. Душою споведзь Уладзіміра Карызны ўлагоджана, а думкі… Думкі сягаюць туды, дзе засталіся не адны згадкі аб перажытым у барацьбе з захопнікамі, а і радасныя сустрэчы. Эмацыянальны каларыт іх узмацняецца дзякуючы мясцовым рэаліям:

Я толькі слова вымаўлю:
В’етнам,
Як зоркі Хошыміна
Ўспыхнуць роем,
З плантацыі зялёнай
Пад Ханоем
Запахне
Успамін,
Нібы банан.

У вершы ж «Паэты В’етнама» супастаўлены дзве рэаліі — ваенная і мірная. Не ведаю, ці меў Уладзімір Карызна на ўвазе вядомы крылаты выраз «Калі гавораць пушкі, музы маўчаць», аднак удала патлумачыў яго в’етнамскімі рэаліямі, якія дазваляюць упэўніцца, што, якімі б суровымі ні былі абставіны, паэзія жыцця ўсё адно існуе, хоць і праяўляецца ў іншых абставінах.

Здавалася б, традыцыйная назва і ў вершы «Дзеці», але сэнс у ім адметны, з яго відаць, наколькі непадобныя хлопчыкі і дзяўчынкі з гэтай далёкай краіны да іншых дзяцей. Сказана і не шмат, аднак дэталі цікавыя: «Радуюся, // Дзеці В’етнама, // Калі рыдлёўкаю // Размаўляеце вы з зямлёй, // Або несяце на далоні, // Як здабытае сонца, // Футбольны мяч», а гэтая найбольш сэрцу любая, таму што перадае, як любяць яны сапраўднага сябра:

Радуюся я,
Калі,
быццам ласкавае мора,
Аблашчваеце
Вы маё сэрца
Вачыма
І воклічамі: «Ленсо!»

«Ленсо» па-в’етнамску азначае: «Савецкі сябар». Пра дзяцей гэтай краіны Уладзімір Карызна расказаў і ў кнізе «Кыонг і яго сябры», адрасаванай юным чытачам. Яна не такая аб’ёмная, але вершаў «Дом Кыонга», «Зямля В’етнама», «Які Кыонгу сніцца сон?», «Куды спяшаецца маці Кыонга?», «Чым займаецца Кыонг?» і іншых дастаткова, каб атрымаць пэўнае ўяўленне аб гэтай краіне.

У В’етнаме Уладзімір Іванавіч неаднойчы чуў слова «Ленсо!», якое ласкала слых. Шмат дзе прамаўлялі яго з любоўю, з павагай, з радасцю за тое, што сапраўды сустрэлі таго, хто разумее цябе. З удзячнасцю да Савецкага Саюза выконвалі і песні, якія для некаторых в’етнамцаў сталі сваімі. У гэтым пераконваюць вершы «Дзяўчына з горада Намдзінь» і «Танец».

Як не захапіцца было намдзіянкай:

Не паходка,
а музыка,
Што світанне нагадвае,
Якое ласкава і юна
Нараджаецца на зямлі.
На макушку пастаў
Гарлачык
з контурам
Сіняга шчасця,
Дык ні кропелькі
не расплешча яго…

Гэтым захапленнем і напоўнены наступныя радкі: «І я ўглядаюся ў вочы, // Што вугельчыкамі // Пераліваюцца, // Ноч валасоў // запальвае // Зорку // ў сэрцы маім». Пачуцці пераліваюцца тым узрушэннем, якое здаецца не мае меж: «Такіх прыгожых ніколі // На свеце // Яшчэ не бачыў, // Таму з-за свету // Варта ехаць было».

У вершы «Танец» «заварожаны // Чарнявыя дзяўчаты, // Загарэліся // Агнямі вачаняты», калі выконваецца «з Белай Русі // Дзіўны танец пра каханне», які называецца «Журавінка». Гэта таксама сведчыла аб тым, што ў часы агрэсіі ЗША, як і пасля завяршэння гэтай злавеснай вайны, было паразуменне паміж двума вялікімі народамі. Вялікім савецкім, які насялялі прадстаўнікі многіх народаў і нацыянальнасцяў, і вялікім в’етнамскім. Яго па колькасці куды меней. І не толькі ў параўнанні з савецкім, а і амерыканскім. Ды святая вера ў перамогу надала ім найвялікшай сілы, прымусіла злачынцаў спыніць агрэсію.

Гэтую свяшчэнную вайну Уладзімір Карызна паказвае праз раскрыццё духу в’етнамцаў, якія супрацьстаялі да зубоў узброенаму праціўніку. Яго творы важныя і таму, што да яго ў беларускай літаратуры амаль не пісалі пра В’етнам. Істотны і такі момант. Поруч з вершамі пра гэтую цудоўную краіну ён змясціў творы, у якім, так званае «свабоднае грамадства» паўстае ў сваім непрыглядным выглядзе. Шмат гаварыць пра іх не буду. Спашлюся толькі на верш «Расколіна на звоне».

У аснову пакладзены рэальны факт. У Філадэльфіі знаходзіцца Звон Свабоды — адзін з галоўных сімвалаў амерыканскай барацьбы за незалежнасць ад Вялікабрытаніі. Даўно ўжо ён з расколінай, але амерыканцы спрабуюць усё адно ўспрымаць яго «вестуном // свабоды // на Зямлі». Завяршэнне верша, супастаўляючы падзеі, якія некалі адбываліся на в’етнамскай зямлі, а сёння, дзякуючы заморскім «дабрачынцам», па-ранейшаму ўскалыхваюць планету, успрымаецца не толькі пытаннем чалавека сумленнага, а і паэта з выразнай грамадзянскай пазіцыяй: «Няўжо // не чуеце, // панове, // Што звон Свабоды // Не звініць?» Гэта не можа не наводзіць на роздум. Як у народзе кажуць, колькі вяровачцы не віцца, а… Праўда і здаровы сэнс перамогуць. Як было і ў В’етнаме, і ў іншых авантурах, якія не даюць спакою ЗША і іх васалам.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Гульня: рэальнае і ўяўнае

Экспазіцыя «*GamEmotion*» падзелена на тры раздзелы. У адным з іх пад назвай «*Game*-інтэрактыў» мастацтва разглядаецца ў якасці інтэрактыўнай гульні. З усімі работамі тут можна і нават неабходна ўзаемадзейнічаць — гэта пляцоўка для гледача, гатовага не столькі сузіраць, колькі супрацоўнічаць з аўтарам той ці іншай работы: то бок, дапаўняць, манеўраваць, будаваць, у пэўнай ступені ўплываць на змест твора — дынамічнай сістэмы. Усё часцей публіка знаёміцца з падобнымі эксперыментамі — аўтары, як правіла, прадстаўнікі маладога пакалення, запрашаюць да асаблівай гульні, мэта якой — адыход ад правіл і канонаў у мастацтве. У абодвух бакоў такім чынам назапашваецца вопыт камунікацыі і сумеснай творчасці. У чым спрыяе такі вопыт? У чым дапамагае? Ці ўплывае на мастацкі працэс? Пакуль зрабіць высновы складана, бо рана — кірунак сёння актыўна развіваецца. Што тычыцца беларускага мастацтва, то тут сябе спрабуюць, напрыклад, Таццяна Савік (яна прадставіла некалькі работ, у тым ліку «*Módulo, Texture, Movimento*» 2023 года, што трансфармуецца) і Паліна Корзун-Фомчанка (яе «Спектр» і «Вейнот» 2022 года даўно заваявалі прыхільнасць публікі).

Іншы сегмент — «*Game*-лічбавая прастора» — аб'ядноўвае ў сабе новыя формы творчасці, сярод якіх ёсць лічбавы жывапіс ды ілюстрацыя, *3D*-графіка, *digital*-інсталяцыя, *NFT*. Гэты кірунак называюць таксама мультымедыйным — мастацтвам новых медыя, якое даследуе ў тым ліку пытанні штучнага інтэлекту. І тут і там гучаць дыскусіі аб прыродзе мастацтва і ўдзеле ў творчым працэсе машыны. Ці апраўдае сябе новы спосаб мыслення? І на чыім баку перавага — мастакі ці машыны? Вось пра што разважаюць у тым ліку беларускія творцы, тэарэтыкі мастацтва. Сярод аўтараў, творы якіх склалі гэтую частку выстаўкі, — Мікіта Вайлупаў («*Fashion director*», 2023), Андрэй Церахаў («Дрывасек», 2020; «*Chimera*», 2024; «*The world is yours*», 2024), Павел Валошын («Sator (Сейбіт)», 2020; «Арт-канвеер», 2020), Аляксандр Некрашэвіч («Мыльныя пузыры», 2010; «Дыялог», 2021; «Дыскатэка», 2021), Дзмітрый Ганчароў («Звычайны дзень у Мінску», 2023).

Работы Андрэя Шыловіча і Марыі Копець у экспазіцыі.

Нарэшце, у частцы выстаўкі «*Game*-паглыбленне» дэманструюцца работы ў традыцыйных відах мастацтва, прысвечаныя тэматыцы гульні ў самых розных інтэрпрэтацыях. Тут, апроч іншага, уздымаецца праблема зацікаўленасці, далучанасці гледача да творчасці жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў, што выяўляюць сябе ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Справа ва ўспрыманні сучаснай публікай, звыклай да празмернага спажывання яркага візуальнага кантэнту, узораў традыцыйнага мастацтва. Многія музейшчыкі, галерэйшчыкі, а таксама мастацтвазнаўцы мяркуюць, што ўжо звыклая віртуальная рэальнасць робіць, так бы мовіць, застылыя творы мастацтва меней прывабнымі для аўдыторыі. А зразумець сэнс задумы, атрымаць эстэтычную асалоду ад убачанага можна толькі пасля поўнага паглыблення. Пра гэта і вядуць гутарку Фёдар Шурмялёў (ён прадставіў цікавую работу 2016 года «Паэзія працы. Прылада прыгажосці» ў тэхніцы «асамбляж»), Ганна Мельнікава (уражвае яе серыя «Забытыя часам» 2021 года), Канстанцін Вашчанка (запамінальныя яго «Марская пушка» і «Трак» 2013 і 2014 года адпаведна), Андрэй Вараб'ёў (мастак працягвае роздум над сэнсам жыцця і сваім месцам у ім — гэтым разам прадстаўлена яго бронзавая скульптура «Дзве грані жыцця» 2019 года).

Работы Арцёма Мядзведзева, Вольгі Сямашкі і Карыны Папроцкай у экспазіцыі.

Выставачны праект «*GamEmotion*» у Палацы мастацтва будзе працаваць да 25 жніўня.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

У свеце гармоніі і прыгажосці

Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў запрашае наведаць выстаўку «Лета — маленькае жыццё», дзе некалькі пакаленняў беларускіх жывапісцаў, графікаў і скульптараў паказваюць лета не проста як сезон, а як цэлы сусвет яркіх эмоцый і момантаў.

Праз прызму мастацтва раскрываецца індывідуальнае ўспрыманне аўтарамі лета: дзіцячыя ўспаміны, прыродныя матывы, пачуццё свабоды і лёгкасці, а таксама глыбокія медытацыі на тэму жыцця і часу. Выстаўка, нягледзячы на памеры (толькі дзве залы), цалкам адлюстроўвае прыгажосць і чараўніцтва летняй пары.

Сустракаюць наведвальнікаў работы старэйшага пакалення беларускіх мастакоў — Уладзіміра Кожуха, Раісы Кудрэвіч, Вячаслава Кубарава, Міхаіла Рагалевіча, Пятра Свентахоўскага, Леаніда Шчамялёва і іншых. Іх творы паказваюць рамантыку вясковага жыцця. Прадстаўленыя ў экспазіцыі работы выкананы ў розных жанрах і тэхніках. «Дарога на Зарэчча» Міхаіла Рагалевіча, дзе яркія колеры і адкрытая кампазіцыя адсылаюць гледача да мастацкага напрамку «імпрэсіянізм», з'яўляецца звычайным вясковым пейзажам. Кожны летні дзень у вёсцы падобны да папярэдняга: трэба пасвіць жывёлу, рыхтаваць сена, збіраць ураджай. Аднак на карціне Міхаіла Рагалевіча не відаць гэтай сезоннай мітусні, тут толькі цішыня, спакой і спёка. У цэнтры кампазіцыі — з'яўляецца высокая і старая сасна, пад галінамі якой, па адчуваннях, схавалася амаль ўся вёска. «Дарога на Зарэчча» з-за колеравай палітры нагадвае казачны сюжэт, дзе ёсць месца жартам і тонкай маралі.



Вячаслаў Кубараў «Вечар на Дзісне», 1980 г.

Побач з работамі Міхаіла Рагалевіча размясціўся твор Вячаслава Кубарава «Вечар на Дзісне», выкананы ў стылі «рэалізм». Аўтар выкарыстоўвае мяккія колеры, робячы акцэнт на плаўнасці пераходаў. На першы погляд, цэнтрам кампазіцыі з'яўляюцца коні на вадапоі, круты бераг, які цалкам зарос непралазнымі хмызнякамі, невялікія хаткі ўдалечыні. Аднак, прыглядаючыся, можна заўважыць, што не меньш важна для мастака і адлюстраванне вечаровага небасхілу і яго адбітку на рачных хвалях. Кантраст паміж яркімі насычанымі колерамі травы і светлымі мяккімі адценнямі аблокаў перадае супярэчлівасць летніх вечароў, калі спёка змяняецца чаканай прахалодай.

Падобныя матывы прасочваюцца ў рабоце Пятра Свентахоўскага «Ліпеньская раніца», дзе, выкарыстоўваючы бледныя шэра-зялёныя адценні, мастак адлюстроўвае пахмурны світанак. Ад твора вее свежасцю і спакоем. На размытым фоне вылучаюцца два кані — матуля і яе маленькае дзіця. У правым ніжнім вугле — у простай кашулі пастух. У творы амаль няма прапрацаваных дэталяў, з-за размытых ліній і бледных колераў здаецца, што на луг апусціўся туман…

Сапраўдны «беларускі» настрой адчуваецца ў рабоце Вікторыі Ільіной «Поле», дзе сярод залатых каласкоў жыта вабяць блакітныя «вочкі» незабудак. Просты сюжэт, які прыцягвае ўвагу на доўгі час. Недарэмна твор размешчаны амаль у цэнтры экспазіцыі, быццам аб'ядноўваючы ўсе летнія матывы ў звычайным пейзажы.

Таксама на выстаўцы прадстаўлены і жанр нацюрморта. Класічным прыкладам з'яўляецца работа Элеаноры Бубашкінай «Нацюрморт з грушамі». Твор таксама можна аднесці да стылю «імпрэсіянізм». Выбраная мастаком палітра адсылае гледача на ўсход, дзе квітнеюць тыгровыя лілеі і спеюць крывава-чырвоныя гранаты. Нацюрморт Васіля Касцючэнкі «Яблычны Спас», у параўнанні з работай Элеаноры Бубашкінай, выглядае вельмі спецыфічна. На чырвоным палатне размясціліся такія ж чырвоныя грушы, яблыкі, кавун і дыня. Асабліва бачныя толькі зялёныя яблыкі і зялёная лупіна кавуна.

Міхаіл Рагалевіч «Дарога на Зарэчча», 1985 г.

На фоне астатніх работ моцна вылучаецца карціна Уладзіслава Куфко «Тапаграфія зялёнага», выкананая ў стылі «экспрэсіянізм»: чароўныя сілуэты экзатычных птушак, рэк і дрэў на ярка-зялёным дыване палёў. З-за спецыфічнай тэхнікі нанясення фарбаў здаецца, што ўсе складнікі сюжэта сцякаюць уніз. Гледачы бачаць кампазіцыю зверху, што стварае эфект «палёту».

У другой зале экспрэсіянізм прадстаўлены ў большай ступені. Работа Зоі Літвінавай «Мір дому твайму» — гэта крык, жах і роспач. Твор выкананы ў ярка-жоўтых, чырвоных, аранжавых колерах. Сілуэты людзей і жывёл застылі ў напружанай прасторы. З-за гушчыні адценняў здаецца, што ім не хапае паветра. І толькі вялікія рознакаляровыя аблокі пад апошнімі сонечнымі промнямі выглядаюць спакойна і велічна.

У экспазіцыі прадстаўлены скульптурныя работы Сяргея Сотнікава, Андрэя Асташова і Аляксандра Шаппо. Крохкія шкляныя кампазіцыі Ініты Эманэ (Латвія) прыўносяць марскі брыз і шум хваляў.

Выстаўка працуе да 5 верасня.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

На гарызонце — Гомельшчына

Арганізатары маштабнай выстаўкі «Род Гомельскі» імкнуліся паказаць рознасць светабачання і падыходаў да мастацтва жывапісцаў, графікаў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія ствараюць, разважаючы аб жыцці і яго сэнсе, на адной зямлі. Якой яны бачаць родную Гомельшчыну? Што займае іх думкі? Чым аўтары падобныя і чым адрозніваюцца? І ці можна аб'яднаць паміж сабой тых, хто працуе побач, у адну кагорту, у адзін, няхай і сімвалічны, род? Паразважаем пра экспазіцыю ў Палацы мастацтва, пазнаёміцца з якой можна да 25 жніўня.

Леанід Кір'янаў «Дзяўчынка са збанам», 1993 г.

— Гэтай выстаўкай мы завяршаем цыкл, у якім расказалі пра дасягненні мастакоў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Творцы кожнай вобласці дэманстравалі свае работы ў Палацы мастацтва на працягу некалькіх гадоў, — нагадаў падчас адкрыцця праекта «Род Гомельскі» старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб Отчык. — Фінальны праект, які доўга рыхтаваўся, вельмі адказны для нас. Галоўнае, што ён адбыўся, і глядач можа пазнаёміцца з арыгінальнымі работамі цікавых аўтараў. Гомельская зямля багатая на таленты — згадаць хаця б Рыгора Ніскага, Яўсея Майсеенку, Віталя Цвірку, Гаўрылу Вашчанку, нашых сучаснікаў Зою Літвінаву, Уладзіміра Зінкевіча, Уладзіміра Пракапцова, Рыгора Сітніцу… Іх вельмі шмат — тых, хто працуе ў Мінску, аднак мае дачыненне да Гомельшчыны. Між тым у рэгіёне сёння твораць вельмі добрыя мастакі, таму атрымалася дастойная ўвагі выстаўка.

Арсеній Дваронін «Лета (Прымаўкі)», 2021 г.

«Род Гомельскі» знаёміць з разнастайнымі партрэтамі, нацюрмортамі, тэматычнымі карцінамі, але найбольш шырока прадстаўлены жанр пейзажу. Натуральна, пераважаюць краявіды беларускага Палесся. Найбольш уражальныя — «Бочка» (2021) Аляксандра Касцючэнкі, «У цёплыя краі» (год стварэння не пазначаны) Віктара Ландарскага, «Белыя росы» (2023) Сяргея Ігнаценкі… Амаль усе пейзажысты імкнуцца перадаць пачуццё спакою і асалоды ад таго, што навокал. Лірыка-паэтычным настроем прасякнуты творы ўжо згаданых аўтараў, а таксама Васіліны Снітко («Дворык», год стварэння не пазначаны), Юрыя Платонава («Бабіна лета», 2023), Міхаіла Крота («Снегапад», 2021; «Сонечны сакавік», 2022), Міхася Пранішнікава («Палессе», 2020), Івана Андрасюка («Вечар на рацэ Сож», 2023) ды многіх іншых. Некаторым карцінам уласціва своеасаблівая ўрачыстасць, аднак часцей апяваецца прыгажосць ціхай раніцы, светлага дня, спакойнага вечара на велічным і адначасова сціплым, някідкім Палессі. Асаблівая гаворка ідзе пра тыя куткі, дзе жыццё даўно не віруе, — гэта адна з ключавых тэм у сучасным айчынным жывапісе. Сярод неабыякавых да яе гомельскіх аўтараў ёсць Віктар Стамброўскі, які ў творы «Марозная цішыня» (2023) адлюстраваў невялікі адрэзак вясковай вуліцы, дзе насупраць дагледжаных домікаў стаіць, відаць, нежылая хата, і Леанід Вялічка — адна з яго работ мае вычарпальную назву «Пакінутая вёска» (2023). Чартапалох на першым плане — нібы прысуд, які абскарджанню не падлягае.

Дарэчы, на выстаўцы не так шмат пазнавальных мясцін Гомельшчыны і Беларусі наогул, сам абласны цэнтр толькі зрэдку сустракаецца на палотнах. Прыклады, якія, між іншым, не адрозніваюцца арыгінальнасцю ў выбары аб'екта адлюстравання і кампазіцыйнага рашэння — «Першы снег» (1995) Мікалая Казакевіча і «Горад, што квітнее» (2016) Уладзіміра Андрэянава. З аднаго боку, не вымалёўваецца вобраз вялікага горада, з другога — надаецца болей увагі абагульненым вобразам і важнейшым тэмам, да якіх аўтарам сапраўды хочацца звяртацца.

Між тым прысутнічаюць у экспазіцыі даволі адметныя нацюрморты. Такі належыць пэндзлю Любові Сцяпанавай — яе «Аб дні мінулым» (год стварэння не пазначаны) вызначае лаканічнасць кампазіцыі, рэльефнасць палатна, выразнасць формы. Не можа не ўразіць «Летні нацюрморт» (2021) Аляксандра Касцючэнкі, творчы почырк якога робіць карціны зіхатлівымі, аднак святло і бляск унутраныя, іх крыніца не здаецца відавочнай. І над якімі б сюжэтам ні працаваў жывапісец, запамінаюцца яго работы дзякуючы багаццю фарбаў, асаблівому настрою, што ствараецца ў тым ліку складанай шматколернай гамай.

Наталля Сердзюкова «Масленіца», 2023 г.

І наадварот — расчаравалі партрэтныя работы на выстаўцы: даволі шмат схематызму, штучнасці, часам прасочваецца пэўная млявасць у паказе персанажаў. Адлюстраваннем унутранага аблічча героя, яго псіхалогіі вылучаюцца толькі акварэлі Міхаіла Няхайчыка «У Опцінай пустыні» (2021) і «Партрэт Ігара Бархаткова» (2023), а таксама жывапісныя работы Яфіма Мінявіцкага «Аднадумца. Народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў» (2009) і «Алімпійскі чэмпіён Л. Р. Гейштар» (2010). З павагай да творчай спадчыны Яўгеніі Янішчыц мастачка Святлана Наздрын-Платніцкая падышла да стварэння незвычайнага партрэта паэтэсы, створанага ў 2021 годзе, хоць змяшчэнне на значнай частцы палатна цэлага верша («Жыццё кароткае, як ноч, што забівае…») здаецца даволі разыкоўным ходам.

Усе мастакі так ці інакш выказваюць уласны погляд на сучаснасць, нават калі фармальна гэта прысвячэнні гісторыі, спадчыне і традыцыям, як, дарэчы, інсталяцыя той жа Святланы Наздрын-Платніцкай «Род Гомельскі» (дата стварэння не пазначана). Яе ідэйны складнік цалкам зразумелы, а вось ажыццяўленне задумы, у тым ліку фармальнае рашэнне, выклікае пытанні: ці не занадта шмат дэталяў у кампазіцыі, ці могуць яны быць асэнсаваныя гледачом паасобку і як частка цэлага, наколькі ўвогуле апраўдана выкарыстанне кожнага прадмета ў інсталяцыі… Мастачка запрашае да разгадвання.

І ўсё ж большасць работ нельга аднесці да актуальнага мастацтва — зусім мала роздумаў аб сучасных праблемах (хоць, вядома, справа можа быць у канцэпцыі выстаўкі, а не ў тым, над чым увогуле працуюць гомельскія мастакі). У рэчышчы разваг пра сёння можна згадаць, напрыклад, займальныя работы, у якіх гучаць матывы пазнання космасу, — «З бездані ў прастору» (2014) і «Калі аэранаўты дасягнуць сёмага неба» (дыптых 2022 года) Івана Папова. Яго творы вылучаюцца ў цалкам традыцыйнай па тэмах і вобразах экспазіцыі. Як і выбраная графіка — запамінаюцца «Няведанне» і «Надбудаванне» (абодва дэманструюцца без даты стварэння) Алега Боклага, які зачароўвае загадкавымі сюжэтымі і створанымі міфалагічнымі істотамі, а таксама акварэлі «Брамка» і «Агуркі» (абедзве 2016 года) Святланы Курашовай. Мастачка працягвае найлепшыя традыцыі беларускай графікі — кампазіцыі дакладна прапрацаваны, а немудрагелістасць зместу здольна прывабіць самых розных гледачоў. Каштоўная якасць, ці не так?

Яўгенія ШЫЦЬКА

Аляксандр Касцючэнка «Бочка», 2021 г.

Сяргей Ігнаценка «Белыя росы», 2023 г.

Віталь Дзенісенка «Кампазіцыя», 2021 г.

Нявеста дала згоду!

Напрыканцы сезона ў ТЮГу адбылася прэм'ера

...Калі б вусны Ніканора Іванавіча ды прыставіць да носа Івана Кузьміча, ды ўзяць каліва развязнасці, як у Балтазара Балтазаравіча, ды дадаць крыху ад мажнога Івана Паўлавіча... Хто не памятае формулу выбару ідэальнага мужа ад гераіні Мікалая Гогаля Агаф'і Ціханаўны? Няпросты аказаўся ў яе выбар: каб быў у паненкі адзін жаніх, то што за праблема?.. А вось калі чатыры... Не інакш патрэбна пакласціся на волю Божую ды шляхам простага лёсавання абраць сабе мужа?.. Ці паслухаць сваху альбо разумнага дарадцу, у якога ёсць годны кандыдат... Што чакае пераборлівую нявесту ў спектаклі «Жаніцьба», напрыканцы ліпеня паказалі артысты Беларускага дзяржаўнага тэатра юнага гледача. «Цалкам неверагодная гісторыя ў дзвюх дзеях» — як пазначана на афішы — дапамагла завяршыць тэатру 68-ы сезон з вясёлым настроем.

Камедыя Мікалая Гогаля «Жаніцьба» хоць і была напісаная ў XIX стагоддзі, але ж дагэтуль закранае вельмі далікатную тэму, што тычыцца чалавечых стасункаў. І будзе цікавая для сцэнічнага ўвасаблення, пакуль людзі думаюць пра тое, дзеля чаго і з кім ствараць сем'і, як абіраць сабе пару на ўсё жыццё — от жа, некаторых герояў п'есы Гогаля нават думка пра гэта ўводзіць у ступар. Вядома, сацыяльны кантэкст змяніўся, і некаторыя рэплікі і заўвагі герояў, што аўтар падаваў з пэўнай доляй сатыры, цяпер успрымаюцца, можа, не так востра і актуальна, але галоўнае засталося. Паколькі ёсць людзі з іх прыватным жыццём. І ёсць жаданне асабістага шчасця, якое можа сутыкацца з няпэўнасцю, нявызначанасцю і бояззю нешта мяняць у жыцці з процілеглага боку. А тут нават усведамленне ўсіх выгод шлюбу не стане вызначальным. Што ж, бедная нявеста, калі зробіць не той выбар...

Камічная сітуацыя, якую адлюстраваў Гогаль — тонка і з гумарам. Смешная п'еса, таму дагэтуль застаецца запатрабаванай у тэатрах. І асноўны пасыл зразумелы: выбірай спадарожніка жыцця не па статусе ці пасадзе, а сэрцам. Глядзі не на знешні бок чалавека, адчувай і цані яго душу — каб была не пустая. А задумвацца пра гэта пачынаюць у юнацкім узросце, калі ўзнікаюць першыя пачуцці ды думкі пра тое: а што ёсць шчасце? Ды і з творчасцю Гогаля знаёмяцца яшчэ ў школе. Таму сышлося шмат фактараў, каб «Жаніцьба» з'явілся ў ТЮГу. І адзін з найбольш істотных для тэатра — імя рэжысёра, які ажыццявіў пастаноўку. Сёлета, якраз за месяц да прэм'еры ў Беларусі, расійскі рэжысёр Цімур Кулаў быў адзначаны спецыяльным прызам журы тэатральнай прэміі «Залатая маска» за пастаноўку ў Татарскім тэатры юнага гледача імя Г. Карыева. Але і дагэтуль яго пастаноўкі траплялі ў лонгліст «Залатой маскі». А яшчэ раней гэты рэжысёр быў адзначаны чатырма намінацыямі на вышэйшую тэатральную прэмію Санкт-Пецярбурга «Залаты сафіт», прычым гэта была пастаноўка «Нос» паводле Гогаля ў піцерскім ТЮГу. Наколькі актуальны Мікалай Гогаль, а яго творы — па сутнасці адлюстраванага ў чалавеку — знаходзяцца па-за часам, ён адчуў менавіта тады, калі глыбока аналізаваў і выбіраў падыход да пастаноўкі. Прытым, што і з «Жаніцьбай» Цімур Кулаў сутыкаўся раней, толькі як акцёр, калі выконваў ролю аднаго з жаніхоў Анучкіна.

Працаваць над «Жаніцьбай» у беларускім ТЮГу ён пагадзіўся на запрашэнне дырэктара Веры Паляковай-Макей, з якой яны сутыкаліся на тэатральных фестывалях. Яна не першы раз прыцягвае да супрацоўніцтва маладых рэжысёраў з Расіі, якіх адрознівае асабістае адчуванне матэрыялу. А яны ў ёй бачаць не толькі чалавека, які выконвае адміністратыўныя абавязкі, але і актрысу. У гэтым спектаклі Вера Палякова-Макей іграе няўдалую нявесту Агаф'ю Ціханаўну, купецкую дачку, якая вельмі хоча пабрацца шлюбам з дваранінам (і нават не думае пра тое, які гэта чалавек). На ролю Падкалёсіна, які падумвае ажаніцца і нават звярнуўся да свахі, прызначаныя два артысты — Уладзіслаў Вінаградаў і Дзмітрый Клімовіч. Іх харызма дазваляе зрабіць уражанне на нявесту, але пры гэтым паказаць зерне сумневу: ці сапраўды яна тая самая? ці сапраўды гэта патрэбна? а навошта, калі і самому жыць можна? Неістотна, што далей чакае пераборлівую нявесту. І няважна, што з іншымі жаніхамі ўжо «папрацаваў» праныра Качкароў.

І ўсё адно, як далей складзецца лёс удзельнікаў інтрыгі, кожны з якіх варты смеху, але адначасова варты і жалю. Ну, так бывае ў жыцці, што зробіш...

Знаўцы і аматары творчасці Гогаля адзначаць, што рэжысёрскі падыход дазволіў фактычна захаваць аўтарскую ідэю і тэкст, з якім працавалі даволі ашчадна. Гэта камедыя — і глядач так бачыць гісторыю. Той выпадак, калі Гогаль застаецца Гогалем без надта арыгінальнага рэжысёрскага прачытання. А калі гаворка пра ТЮГ, то гэта таксама мае значэнне: каб у маладога гледача (узроставае абмежаванне спектакля 16+) спачатку склалася ўяўленне пра пісьменніка, а яго інтэрпрэтацыі больш патрэбныя людзям са сфарміраванай свядомасцю, якія разумеюць кірункі і задачы сучаснага тэатра.

Але ж версія ТЮГа атрымалася ўсё ж адаптаванай пад сучаснасць: асаблівая аўдыторыя патрабуе і асаблівай увагі: без нудоты і маралізатарства, з лёгкім падыходам. Нават музыка мае значэнне, неабходны нейкі «драйв» — тут гучыць не толькі класіка, але і рок. Большаму ўспрыманню праз сучаснасць паспрыялі касцюмы і афармленне (мастак-пастаноўшчык Дар'я Волкава): чорная сцэнічная прастора, і на ёй ёсць галоўны сцэнаграфічны элемент — канапа, якая ў залежнасці ад сітуацыі мяняе свой выгляд з дапамогай дываноў і покрываў. Канапа — сімвал дома, утульнасці, нават пэўнай інтымнасці. Ці здольны хтосьці з чатырох жаніхоў затрымацца тут надоўга? Як там у Гогаля?

Ларыса ЦІМОШЫК
Фота з сайта ТЮГа

Чым жыве Купалаўскі?

Завяршыўся 104-ы сезон у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. За гэты час там здолелі рэалізаваць шмат творчых планаў, паставілі некалькі прэм'ерных спектакляў і наладзілі міжнародныя культурныя сувязі.

Як адзначыў генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Аляксандр Шастакоў, сезон запомніцца многім: «Гэта быў сапраўды багаты на падзеі сезон, і я хачу падзякаваць усім супрацоўнікам тэатра за іх самаадданасць, вернасць сваёй справе і натхненне для вырашэння нашых агульных задач. Перад завяршэннем 104-га артысты Купалаўскага тэатра яшчэ раз парадавалі сваіх дарагіх гледачоў новым спектаклем. 26 ліпеня, у дзень закрыцця сезона, купалаўцы па традыцыі паказалі неўміручую «Паўлінку», яна ж сустрэне гледачоў 29 жніўня, у пачатку новага сезона. У 105-м мы абяцаем маштабнае абнаўленне і, вядома, выпуск новых спектакляў!»

За мінулы сезон Купалаўскі тэатр прадставіў гледачу тры новыя спектаклі. Так, напрыканцы 2023 года, 2 снежня, на камернай сцэне прайшла прэм'ера пастаноўкі «Двор майго дзяцінства» ад Даніила Філіповіча, якая была прысвечана Мінску. Яна заклікае людзей да захавання нацыянальных традыцый. А 28 снежня на сцэне прадставілі новы спектакль па вядомым творы Барыса Васільева «А зоры тут ціхія» (пастаноўкай займаўся расійскі рэжысёр Дзмітрый Акімаў). Трэцюю прэм'еру прэзентавалі ўжо 20 сакавіка. Гледачы ўбачылі новую апрацоўку спектакля «Пісаравы імяніны», зробленую рэжысёрам Паўлам Марынічам на аснове аднайменнай п'есы Уладзіслава Галубка. У ёй вельмі яскрава адлюстроўваюцца ўсе рысы беларускага менталітэту.

Асаблівую ўвагу ў гэтым сезоне тэатр удзяліў устанаўленню міжнародных сувязяў з замежнымі тэатрамі і калектывамі. Мінулай восенню з 12 да 26 верасня ў Беларусі праходзілі Дні культуры Рэспублікі Татарстан, у рамках якіх тэатр Янкі Купалы сардэчна прыняў на сваёй сцэне Казанскі акадэмічны рускі вялікі драматычны тэатр імя У. І. Качалава з гастрольным турам. У адказ на гэта купалаўцаў запрасілі са спектаклем «Паўлінка» ў Казань для ўдзелу ў III Качалаўскім фестывалі 20—21 кастрычніка 2023 года.

Пазней, 28 і 29 лістапада, Купалаўскі тэатр зноў сустракаў гасцей з Расіі. Гэтым разам беларускія гледачы атрымалі магчымасць пабываць на пастаноўках Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага драматычнага тэатра «Камедыянты». А вось 24 і 25 мая бягучага года ў рамках Дзён культуры Новасібірскай вобласці на беларускай сцэне выступалі артысты Новасібірскага абласнога тэатра лялек і Новасібірскага дзяржаўнага акадэмічнага Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнага тэатра «Чырвоны факел».

Акрамя гэтага, 104-ы сезон у тэатры Янкі Купалы запомніцца і шэрагам асаблівых падзей. Напрыклад, 22 снежня 2023-га ў Каміннай зале была падпісана дамова аб супрацоўніцтве з Нацыянальным драматычным тэатрам Расіі (Александрынскім тэатрам). Значным для ўстановы культуры стаў удзел у VII Рэспубліканскім конкурсе тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» ў якасці дырэкцыі. Падчас творчага спаборніцтва народная артыстка Рэспублікі Беларусь Тамара Міронава атрымала ўзнагароду ад журы. Купалаўскі тэатр меў гонар стаць адным з арганізатараў II Рэспубліканскага тэатральнага фестывалю «Перамога», які праходзіў з 13 да 23 мая.

Што да гастрольнай дзейнасці, то ў мінулым тэатральным сезоне Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паспеў наведаць шмат гарадоў: Барысаў, Брэст, Кобрын, Магілёў, Мар'іну Горку, Наваполацк, Оршу і іншыя. Зусім нядаўна тэатр прыняў удзел у XXXIII Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» са спектаклем «А зоры тут ціхія».

Таксама адсвяткавалі шмат юбілейных дат: віншавалі Зінаіду Зубкову, Андрэя Зыля, Ірыну Ламака, Уладзіміра Рагаўцова. А знакамітая «Паўлінка» адзначыла сваё 80-годдзе. У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы ўжо рыхтуюцца радаваць сваю публіку новымі спектаклямі ў 105-м сезоне.

Маргарыта ЖЫГАР

Мохаў і яго таямніцы

У васьмі кіламетрах на поўнач ад Лоева на высокіх прыдняпроўскіх мысах знаходзіцца вёска з багатай і загадкавай гісторыяй — Мохаў. У гэтым месцы Дняпро некалі адступіў на два кіламетры на ўсход, утварыўшы шырокую даліну і пакінуўшы каля падножжа вёскі Мохаўскае возера даўжынёй 2,6 кіламетра. У пісьмовых крыніцах Мохаў упершыню згадваецца на пачатку XVI ст. Але вядома, што ён мае больш даўнюю гісторыю і з'яўляецца адным з найстарэйшых населеных пунктаў Беларусі. Аб гэтым сведчыць размешчаны на тэрыторыі вёскі і ў яе ваколіцах унікальны комплекс археалагічных помнікаў.

З 2004 г. важныя даследаванні тут ажыццявіў кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. Крывальцэвіч, які адкрыў на адлегласці 0,15—0,25 кіламетраў на паўночны ўсход ад Мохава позненеалітычныя паселішча-1 і паселішча-2. Пры іх абследаванні знойдзены крамянёвыя вырабы і фрагменты керамікі. На паселішчы-3 за 0,6 кіламетраў на паўночны ўсход ад вёскі ён выявіў кераміку і крамянёвыя вырабы днепра-данецкай культуры (позні неаліт) і сярэднедняпроўскай культуры (бронзавы век), фрагменты посуду ранняга жалезнага веку.

М. Крывальцэвіч адкрыў за 0,65 кіламетраў на паўночны ўсход ад Мохава паселішча-3А, а ў 2008—2009 гг. падчас яго абследавання тут былі знойдзены абломкі ляпнога посуду, вырабы з крэменю днепра-данецкай і сярэднедняпроўскай культур, сасніцкай культуры (бронзавы век — II тыс. да н. э.), мілаградскай культуры (ранні жалезны век —VII—I ст. да н. э.) і другой паловы I тыс. н. э.

Навуковец таксама даследаваў паселішча-4, якое размяшчаецца на адлегласці 0,75—0,9 кіламетраў на паўночны ўсход ад Мохава ва ўрочышчы Шолахаў кут. Гэты археалагічны аб'ект адкрыў у 1956-м і абследаваў у 1975-м археолаг, доктар гістарычных навук Л. Побаль. Тут знойдзена арнаментаваная кераміка, шматлікія крэмневыя артэфакты. Комплекс адносіцца да культур позняга неаліту, бронзавага і ранняга жалезнага вякоў. Паселішча размяшчалася на ўзвышшы, мела зручнае стратэгічнае становішча і ў ранні жалезны век магло выконваць функцыі гарадзішча. Гарадзішча-1 жалезнага веку мілаградскай культуры V—III ст. да н. э. выяўлена ў 2 кіламетрах на поўнач ад вёскі. Яно ўяўляе сабой пляцоўку 200×140 метраў, плошчай да 2,5 га. З боку поля ўмацавана валам вышынёй 3—4 метры, даўжынёй каля 140 метраў. Гарадзішча ў розныя часы даследавалі экспедыцыі археолагаў. Так, выяўлена паглыбленае ў зямлю да 1 метра жытло авальнай формы, у сярэдзіне — сляды адкрытага ачага. Культурны пласт на гарадзішчы складае 30—40 сантыметраў.

Гарадзішча-2 мілаградскай і зарубінецкай культур знаходзіцца 1,5 кіламетра на паўднёвы ўсход ад вёскі, паміж двума ярамі ў бярэзніку ва ўрочышчы Гарадок. Яно ўяўляе сабой пляцоўку 70×60 метры, з боку поля ўмацаваную валам вышынёй каля 5 м і ровам глыбінёй 0,5—2 метраў. Культурны пласт прасочваецца на глыбіні да 60 см. Тут каля паўзямлянкі і вала В. Мельнікоўскай выяўлены бескурганны могільнік мілаградскай культуры. Пахавальны абрад у ім — трупаспальванне, калі памерлых спальвалі за межамі могільніка.

У сувязі з археалагічнымі даследаваннямі і адкрыццямі савецкіх вучоных, а таксама вынікамі даследаванняў беларускіх навукоўцаў апошніх гадоў узнікае пытанне аб месцы і ролі Мохава часоў ранняга жалезнага веку ў сістэме тагачаснага рассялення насельніцтва. Дарэчы будзе згадаць працу «Геаграфія» знакамітага вучонага Старажытнай Грэцыі Клаўдзія Пталамея, які ўпершыню ў сусветнай гісторыі выдзеліў на працягу Барысфена (Дняпра) пяць геаграфічных рэгіёнаў: Азагарый, Ольвію, Сар, Метраполь і Амадоку. Большасць даследчыкаў «Геаграфіі» атаясамліваюць Метраполь з Кіевам і яго ваколіцамі. А па іншых найменнях няма адзінага погляду.

Некаторыя навукоўцы, спасылаючыся на працу візантыйскага гісторыка і дыпламата сярэдзіны V ст. Прыска Панійскага, выказваюць здагадку, што Амадока — гэта мясцовасць, якая размешчана на поўнач ад Кіева, у лясной зоне з густой рачной сеткай, дзе шырока выкарыстоўваюцца ў якасці плаўсродкаў плыты і чаўны-аднадрэўкі. Як сцвярджаў антычны Пталамей, Амадока была рамесным цэнтрам. Улічваючы тое, што ў раёне сучаснага Мохава надзвычай вялікі россып археалагічных помнікаў ранняга жалезнага веку і з глыбокай старажытнасці вырабляліся і выкарыстоўваліся чаўны-аднадрэўкі і плыты, ёсць падставы меркаваць, што тут у першай палове I тыс. н. э. існаваў адзін з галоўных цэнтраў Амадокі.

Фота з сайта hse.ru

Падчас раскопак каля вёскі Мохаў, 2014 г.

Значна папоўніла звесткі аб мінулым Мохава археалагічная экспедыцыя Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны пад кіраўніцтвам прафесара, доктара гістарычных навук А. Макушнікава, якая на працягу 2003—2019 гг. даследавала Мохаўскі археалагічны комплекс. Ужо ў 2003 г. падчас навуковай разведкі і раскопак гэтая экспедыцыя выявіла на паўднёвай ускраіне вёскі яшчэ адну групу археалагічных помнікаў: рэшткі стаянак эпохі неаліту і бронзавага веку, сляды селішча кіеўскай і калачынскай археалагічных культур ва ўрочышчы Багданава Прыстань, а таксама рэшткі трох сярэдневяковых паселішчаў ва ўрочышчах Аколіца, Прычолак, Высокае (Вялікае) Поле.

Асаблівую цікавасць даследчыкаў выклікаў найбуйнейшы ў Беларусі курганны могільнік-1 культуры Старажытнай Русі X—XI стст., які размяшчаецца ў паўднёва-ўсходняй частцы вёскі. Курганы насыпаны на месцы больш ранніх помнікаў — стаянак каменнага і бронзавага вякоў, грунтавога могільніка і селішча ранняга жалезнага веку, раннеславянскага пасялення сярэдзіны I тыс. н. э.

Могільнік выявіў яшчэ ў 1890 г. і даследваў 26 курганоў вядомы археолаг беларускага паходжання У. Завітневіч. У канцы XIX ст. у ім налічвалася не менш за 600 курганоў, але зараз засталося крыху больш за 300 паўсферычных насыпаў рознай захаванасці. У. Завітневіч падчас раскопак вызначыў, што пахаванні ў большасці курганоў ажыццяўляліся па абрадзе трупаспальвання са змяшчэннем парэшткаў у ўрнах, але ёсць пахаванні і па абрадзе трупапалажэння. У некаторых магілах захаваліся рэшткі драўляных пабудоў. Пры раскопках былі знойдзены нажы, сякеры, рэшткі керамікі, упрыгажэнні. Калекцыя знойдзеных артэфактаў захоўваецца ў фондах Дзяржаўнага гістарычнага музея Расіі ў Маскве. Мохаўскі курганны могільнік занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Экспедыцыя ГДУ імя Ф. Скарыны даследавала рознаэтнічныя мужчынскія і жаночыя пахавальныя комплексы, у якіх былі выяўлены каменныя і металічныя прылады працы, рэчы вайсковага побыту і зброя, шкляныя і бронзавыя ўпрыгажэнні, кераміка, манеты… Некаторыя пахаванні ўтрымлівалі рэчы, якія сведчаць аб знатнасці памерлых. Экспедыцыя выявіла таксама на правабярэжным поплаве Дняпра за возерам ва ўрочышчы Могільцы курганны могільнік-2, які налічвае 15 курганоў. Калекцыя археалагічных знаходак экспедыцыі захоўваецца ў музеі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля і Археалагічным музеі-лабараторыі ГДУ.

Мяркуецца, што ў курганах пахаваны воіны і гандляры, якія разам з рамеснікамі складалі асноўную частку насельніцтва сярэдневяковага Мохава. Асаблівасці пахавальных абрадаў і выяўленых пры раскопках рэчаў дазволілі навукоўцам зрабіць выснову, што склад насельніцтва быў рознаэтнічным.

Каля Мохаўскіх курганоў ва ўрочышчы Прычолак выяўлена буйное паселішча-5, частка якога з'яўляецца гарадзішчам-3. Тут з дапамогай шурфоўкі былі выяўлены рэшткі абарончых збудаванняў. Даследаванні ў паўночна-ўсходняй частцы помніка паказалі, што на ім старажытнарускія напластаванні, якія пакрываюць сабой рэшткі стаянак эпох неаліту і бронзы, селішчаў познезарубінецкай і пражскай культур.

Росквіт у жыцці паселішча прыпадае на другую палову X — першую палову XI ст. А. Макушнікаў лічыў, што тады ў Мохаве існавала буйное ваенна-гандлёва-рамеснае паселішча, жыхары якога кантралявалі ў гэтым месцы важнейшую транспартную артэрыю сярэднявечнай Усходняй Еўропы — Дняпро і ўдзельнічалі ў стварэнні Старажытнарускай феадальнай дзяржавы часоў вялікіх кіеўскіх князёў Ігара, Вольгі, Святаслава, Уладзіміра і Яраслава Мудрага. Адной са стратэгічных задач Мохава ў X—XI стст. мог быць таксама і кантроль за рухам качэўнікаў-стэпавікоў з поўдня і адпор ім.

Гэта быў таксама буйны ваенны лагер на дняпроўскім адрэзку шляху «Вялікага палюддзя», які паэтапна ствараўся і ўмацоўваўся вялікакняжаскай уладай падчас «збірання»і канчатковай кансалідацыі ўсходнеславянскіх земляў вакол Кіева. Больш за 900 гадоў таму тут віравала жыццё. У паселішчы пражывала прыкладна тры тысячы жыхароў, якія займаліся карабельнай справай, працавалі лесарубамі, цеслярамі, кавалямі, збройнікамі. Ярка выражаны сацыяльна-адасоблены і ўзброены склад насельніцтва сведчыць аб тым, што значную частку яго складалі воіны і члены іх сем'яў. Агульная плошча Мохава налічвала не менш за 25 гектараў.

Можна меркаваць, што дадзенае паселішча — гэта «станавішча» (пагост), дзе жылі дружыннікі князя — даннікі, вірнікі, емцы, отракі — і збіралі даніну з мясцовага насельніцтва. Падчас палюддзя яно прымала самога князя і значную колькасць яго воінаў, слуг, ездавых, ганцоў. На думку А. Макушнікава, ваенізаванае шматфункцыянальнае паселішча Мохаў разам з суседнім паселішчам на Лоевай гары (Лоеў) утварала ў X—XI стст. бінарны (падвоены) комплекс паселішчаў на старажытным шляху «з варагаў у грэкі». Між тым паселішча на Лоевай гары яшчэ не дастаткова даследавана, таму нельга выключаць, што Мохаў быў у бінарнай сувязі з Любечам, які ўпершыню згадваецца ў летапісе 882 г., і знаходзіўся на адлегласці больш за 40 кіламетраў ніжэй на левабярэжжы Дняпра, але вялікая рака, безумоўна, садзейнічала інтэнсіфікацыі зносін паміж паселішчамі.

Недзе ў другой палове XI ст. Дняпро страціў сваё рэчышча і адышоў на ўсход ад Мохава, што прывяло да ўтварэння Мохаўскага возера і натуральна пасунула гэтае паселішча на перыферыю гандлёвага шляху, стварыўшы перадумовы да яго паступовага заняпаду. А. Макушнікаў называў і сацыяльна-эканамічную прычыну заняпаду: яна заключалася ў пераводзе дружыны ад практыкі аплаты вайсковай службы грашыма, зброяй і іншымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі да практыкі раздачы воінам у трыманне або ва ўласнасць земляў з вёскамі і сялянамі. Менавіта ў XII ст. княжаскія дружыннікі актыўна надзяляюцца землямі і асядаюць на іх, каб развіваць уласную феадальную гаспадарку. Роля гаспадарчага і палітычнага цэнтра рэгіёну з гэтай пары пачынае паступова пераходзіць да суседняга паселішча Лоева гара, якое знаходзіцца ў зручным геаграфічным становішчы.

У даследчыкаў выклікае цікавасць таксама і само паходжанне тапоніма «Мохаў». Паданні звязваюць яго ўзнікненне з балотнай раслінай — мохам. І сапраўды, на захад ад вёскі і ў даліне Дняпра ёсць невялікія балоты, якія раней маглі быць мохавымі. Аднак, гэтая назва ніяк не стасуецца з характарам мясцовасці — узвышанай і ўзгорыстай. Не выключана, што назва паселішча магла паходзіць ад назвы родаплемянной супольнасці «мохі» або ад імя яе старэйшыны ці ўладальніка гэтых земляў — Моха альбо Мохава. Што датычыцца пісьмовых крыніц, вядома, што Мохаў упершыню згадваецца пры апісанні пахода арды Перакопскага хана Мехмет Гірэя «на Лоеву гару, … замак Менск, … і пад Слуцак» летам 1505 г. Падчас гэтага пахода 5-ці тысячны татарскі загон зруйнаваў не толькі Лоеўскі замак, але і суседні Мохаў.

…Няма сумненняў, што новыя даследаванні Мохава і яго археалагічнай спадчыны здольны адкрыць нам яшчэ не адну таямніцу.

Мікалай АНІСАВЕЦ

Тэрміны творчага выказвання

Да дня нараджэння Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў адкрылася выстаўка «Слоўнікавы запас», дзе сучасныя мастакі-авангардзісты падзяліліся з наведвальнікамі сваімі разважаннямі на тэму мастацкіх тэрмінаў, якія трансліруюць новы погляд на свет у эпоху тэхнагеннай цывілізацыі.

Сучасным мастацтвам прынята лічыць перыяд другой паловы XX — пачатак XXI стагоддзяў. На першы погляд здаецца, што ў гэтым часе няма адзіных прынцыпаў і правілаў. Творчасць дастаткова разнапланавая, кожны мастак імкнецца падкрэсліць сваю індывідуальнасць і выпрацаваць асабісты, не падобны на іншых, стыль. Аднак усіх сучасных творцаў аб'ядноўвае важны сацыяльны фактар — жаданне адлюстраваць злабадзённыя тэмы, праблемы ў грамадстве, улічваючы асабісты светапогляд і жыццёвы досвед.

Здаецца, зусім нядаўна тэрміны «імпрэсіянізм», «супрэматызм», «сюррэалізм» былі чымсьці незвычайным і інавацыйным. Аднак сучасныя мастакі ўжо даўно «перараслі» гэтыя паняцці і пачалі карыстацца новымі. У творчым асяроддзі часта можна пачуць «індыджанізм», «артывізм», «брэндалізм». Апошнія тэрміны апісваюць напрамкі канцэптуальнага мастацтва, якія маюць пэўную сістэму творчага выказвання і камунікацыі. Яны пашыраюцца, становяцца зразумелымі і папулярнымі, асабліва сярод моладзі.

«Думаю, мы ўкладаліся ў колькасць літар у алфавіце, аднак, калі так будзе і далей, спатрэбіцца пашыраць алфавіт», — адзначыў на адкрыцці выстаўкі дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Сяргей Крыштаповіч.

Васіліса Васілеўская «Volkano», 2024 г.

Сёлета Цэнтру спаўняецца дзевяць гадоў, і выставачны праект «Слоўнікавы запас» стане своеасаблівым пачаткам новага мастацкага фестывалю, які будзе прымеркаваны да юбілею арганізацыі ў наступным годзе. «Таму ўжо магу задаць такі тон і сказаць: Стварайце

Мікалай Дундзін «Бойка», 1989 г.

новыя работы!», — выступіла з прамовай намеснік дырэктара НЦСМ па творчай рабоце Алеся Іназемцава.

У аснове канцэпцыі праекта знаходзіцца багацце мастацкіх стыляў. Разнастайнасць тэрмінаў адлюстроўвае як асабісты працэс развіцця мастака на творчым шляху, так і агульную з'яву ў мастацтве — пошук новых магчымасцяў і сэнсаў.

На выстаўцы прадстаўлены жывапісныя палотны, скульптурныя аб'екты і кампазіцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Работы не аб'яднаны адзінай стылістыкай, жанрамі і тэхнікамі. Гэты яркі і шматгранны «выбух» авангарда прываблівае глыбінёй сюжэтаў і арыгінальнымі ідэямі. Мастакі падымаюць розныя сацыяльныя тэмы, дзеляцца ўласнымі перажываннямі і спрабуюць перадаць пачуцці праз фізічную форму.

Фотапраект Галіны Рапека «Архіў, якога няма» паказвае трагічную гісторыю сям'і творцы. Мастачка расказвае пра небяспечную атмасферу, якая склалася ў яе доме з-за жорсткага характару маці. Галіна вельмі сумавала і зайздросціла сябрам, якія з цеплынёй і замілаваннем гартаюць старыя сямейныя фотаальбомы. Ужо будучы дарослай мастачка знайшла ў сямейным архіве пусты альбом, які стаў для яе «больш нечаканым і жывым, чым калі б ў ім па-ранейшаму захоўваліся фотаздымкі»… Праект прасякнуты холадам і адзінотай, якая адчуваецца ад пустых старонак старога абшарпанага альбома.

Такі ж настрой у інсталяцыі Андрэя Пічушкіна «Панелька», зробленай з крэслаў, пледаў і прышчэпак. Кампазіцыя вяртае гледача ў дзяцінства, калі будаваць шалаш з крэслаў, падушак і посцілак — гэта важная частка развіцця маленькага чалавека. У гэтым крохкім і недаўгавечным сховішчы дзеці знаходзяць пачуццё самотнасці і абароненасці, знаёмяцца з паняццем уласнасці. Аўтар разважае пра будаўніцтва панельных дамоў, якое павінна было вырашыць праблему з недахопам жылой плошчы ў пасляваенны перыяд. Яны давалі новым жыхарам тое пачуццё абароненасці і прыватнасці, якога не было ў бараках і камуналках. Аднак памылкі ў будаўніцтве, тонкія сцены падкрэслівалі зменлівасць жыцця. «У сваёй інсталяцыі я спалучаю цёплыя ўспаміны з дзяцінства з постсавецкімі рэаліямі, адлюстраванымі ў кінахроніцы, і ствараю вобраз, які прапаноўвае гледачу спыніцца і задумацца пра сваё мінулае, пра спадыну ўжо неіснуючай краіны…», — дзеліцца Андрэй Пічушкін.



Юлія Цярэшка «Метафізічная галава», 2023 г.

Прываблівае выкарыстанне мастакамі розных матэрыялаў і тэхнік. Васіліса Васілеўская выканала трыпціх «Поле» з дапамогай вугалю, Максім Зубра ў рабоце «Клаўстрафобія» выкарыстаў гіпс і дрэва, Юлія Цярэшка прыцягвае ўвагу мазаічным малюнкам.

Праект Вольгі Сямашка «Одум» нагадвае знакаміты малюнак з запалкамі, які калісьці быў вельмі папулярны на абшарах інтэрнэту. Аўтар у форме звычайных латкоў для яек, якія выбудаваны ад пяшчотна-белага да вугальна-чорнага, адлюстроўвае працэс развіцця думкі, пачуцця, эмоцыі ўнутры чалавека. Кожны знойдзе свой сэнс.

Выстаўка «Слоўнікавы запас» заклікае пачынаючых і прафесійных майстроў рухаць сучаснае мастацтва Еўропы і ўсяго свету да вышэйшых ступеняў яго развіцця. У межах праекта будуць працаваць куратарскія экскурсіі, будзе арганізавана дыскусійная пляцоўка пра сучаснае мастацтва.

Экспазіцыя працуе да 6 кастрычніка.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

зваротная сувязь

Сагрэем душу добрым словам

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты». У чацвер — публіцыстычная перадача Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова».

Радыёверсію тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча можна паслухаць у нядзелю і панядзелак.

Па буднях у праграме «Літаратурная анталогія» — аповесць Васіля Быкава «Альпійская балада». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы — раман Уладзіміра Багамолава «У жніўні сорак чацвёртага».

У праграме «Прачулым радком» у выхадныя — вершы беларускіх пісьменнікаў.

«Літаратурныя гісторыі» пазнаёмяць з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у суботу і нядзелю прагучыць спектакль «За лясамі дрымучымі» паводле твора Артура Вольскага, Петруся Макаля.

Для юных прыхільнікаў мастацкага слова — праект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — казка «Чараўнік краіны ОЗ» Фрэнка Баума. Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для самых маленькіх.

Праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам новага нумара «ЛіМа».

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка Валянціна МАСЛЮКОВА і выказваюць спачуванні яго родным і блізкім.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 08.08.2024 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 689

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 1894
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 24030